К. ДУБРОЎСКІ

Ба 4848

# У панстве нагайкі і шыбеніцы



667-р.ч

Б.Дз.В.

2470.

ЗЬВЯРНЕЦЕ КНІГУ НЕ ПАЗЬНЕЙ

ПАКАЗАНАГА ТУТ ТЭРМІНУ

Ба 4848

К. В. ДУБРОЎСКІ

# У ПАНСТВЕ НАГАЙКІ І ШЫБЕНІЦЫ

## СІБІРСКАЯ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯ 1918 — 1919 гадоў

Пераклаў з расійскай мовы ~~Ў. Хадыка~~

Інв. 1953 г. Бн 4848
Бел. аддзел 1994 г.
Дзяржаўная бібліятэка БССР імені ЛЕНІНА
2470

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Вокладка В. Шульца

25. 04. 2009

Заказ № 1024. 5.000 экз. ($3^{5}/_{8}$ арк.) Галоўлітбел № 1058.

Друкарня БДВ імя Сталіна.

# Сібірскае ліхалецьце

Гэта былі для Сібіры сапраўды ліхія, жахлівыя гады... Такога злога, крывавага ліхалецьця Сібір ня ведала, ды і бадай ня будзе ведаць. Ня доўга цягнулася яно: усяго толькі два гады—дзевяцьсот восемнаццаты і дзевятнаццаты. Але гэтыя два гады, за перажытае працоўнымі масамі, варты цэлых дзесяткаў год. Цяжка пералічыць усю шкоду і напасьці, што панесьлі сібірскія рабочыя і сяляне за гэты кароткі час. Некалькі сот зруйнованых, выпаленых дашчэнту сёлаў і вёсак, дзесяткі тысяч зрабаваных да ніткі мужыцкіх гаспадарак, сотні тысяч закатаваных і забітых людзей, цэлыя рэкі пралітай чалавечай крыві і мільёны бяздомных, жабракоў, калек, удоў і сірот... Вось што пакінула ў спадчыну пасьля сябе гэта чорная, ліхая часіна ў Сібіры і ў сумежных з ёю акругах Прыуральля і Далёкага Ўсходу. Ї нездарма сібірскія сяляне і сялянкі ўспамінаюць яе са страхам, з напазбыўнаю тугою і болем сардэчным. У шмат каго яшчэ не пасьпелі загаіцца на целе крывавыя раны і ніколі ня згладзяцца нанесеныя ім калецтвы. Але яшчэ цяжэйшыя і незабытныя страты блізкіх дарагіх людзей, якія сталі ахвярамі крывавага

разгулу. А ахвяры гэтыя вялікія і бездаплатныя. Рэдка ў якой сялянскай сям'і ня было іх. У каго замучаны пякельнымі катаваньнямі бацька, у каго пасечаны на кавалкі сын, у каго закапаны жывым у зямлю адзіны брат. Там згвалчаны, а пасьля дзіка забіты сёстры альбо дочкі, там спалена ў печцы малое дзіця, тут расстрэляны муж, які пакінуў пасьля сябе жонку з маленькімі дзеткамі... У іншых сем'ях перабіты ўсе—і стары і малы, у другіх захаваліся толькі друзлыя, бяспомачныя старыкі. Ды ўсяго і не пералічыш... Нават у староньняга чалавека ад адных толькі расказаў пра ўсе гэтыя жахі стыне кроў у жылах. А як-жа ўспамінаць пра іх тым, хто сам перажываў іх?!

Але хто-ж яны—гэтыя людзі-зьвяры, праз якіх зазнала столькі гора, непапраўнай шкоды і цяжкай крыўды працоўнае сібірскае насельніцтва? І за што, за якія злыя ўчынкі, яны гэтак дзіка распраўляліся з ім?

Імёны гэтых ліхадзеяў, як і іхныя злачынныя справы, таксама сьвежыя яшчэ ў памяці сібіракоў і ня скора забудуцца ў Сібіры. Гэтымі імёнамі маткі-сібірачкі палохаюць непаслухмяных дзяцей. І яшчэ шмат і шмат год яны будуць перадавацца з роду ў род, ад аднаго пакаленьня другому, з праклёнамі і нянавісьцю.

Гэта—імёны белых сібірскіх атаманаў: Аненкава, Іванова-Рынава, Красільнікава і шмат іншых. Усе яны разбойнічалі і катавалі адначасна ў розных мясцох Сібіры, дзе верхаводзіў тады галоўны іх

«бацька»—царскі адмірал Калчак, які самазвана называў сябе найвышэйшым кіраўнікам Расіі.

У гэтай кніжцы будзе расказана пра тое, як разбойнічалі і распраўляліся з сібірскімі сялянамі і ра-



Трупы закатаваных белагвардзейцамі сялян.

бочымі гвалтаўнікі і каты працоўнага народу за тое, што тыя не хацелі прызнаваць над сабою ўлады капіталістых і генэралаў, за тое, што яны моцна стаялі за сваю ўладу, за ўладу сялян і рабочых.

## Як аселася ў Сібіры контррэволюцыя

Галоўная маса сібірскага насельніцтва—сялянства, у значнай сваёй частцы заможнае,—у пачатку Кастрычнікавай рэволюцыі заняла нэўтральную пазыцыю і недапамагала савецкай уладзе. Гарадзкі-ж про-

«бацька»—царскі адмірал Калчак, які самазвана называў сябе найвышэйшым кіраўніком Расіі.

У гэтай кніжцы будзе расказана пра тое, як разбойнічалі і распраўляліся з сібірскімі сялянамі і ра-



Трупы закатаваных белагвардзейцамі сялян.

бочымі гвалтаўнікі і каты працоўнага народу за тое, што тыя не хацелі прызнаваць над сабою ўлады капіталістых і генэралаў, за тое, што яны моцна стаялі за сваю ўладу, за ўладу сялян і рабочых.

## Як аселася ў Сібіры контррэволюцыя

Галоўная маса сібірскага насельніцтва—сялянства, у значнай сваёй частцы заможнае,—у пачатку Кастрычнікавай рэволюцыі заняла нэўтральную пазыцыю і недапамагала савецкай уладзе. Гарадзкі-ж про-

летарыят Сібіры сам па сабе невялікі ня мог без падтрыманьня сялянства замацаваць свае заваёвы. Гэта скарысталі сібірскія эсэры і буржуазія, каб зрынуць ненавісную ім савецкую ўладу. Узьняць супроць саветаў гарадзкі пролетарыят і сялянскія масы няма чаго было і думаць: рабочыя масы гарой стаялі за саветы, а сяляне не хацелі ўцягвацца ў грамадзянскую вайну. Таму вось эсэры і буржуазія выступілі з дапамогай чужаземных штыхоў. Выпадак хутка дапамог ім.

У той час (увесну 1918 г.) праходзілі праз Расію на ўсход чэха-славацкія вайсковыя часьці, якія вярталіся з расійскага палону ў Чэха-Славакію. Ішлі яны на Уладзівасток, каб адтуль морам прабрацца на радзіму. Чэха-славакі былі ўзброеныя. Савецкая ўлада ня зьверылася на камандны склад чэха-славакаў, які меў сувязь з расійскай буржуазіяй, і запрапанавала ім разброіцца. Чэха-славакі адмовіліся. Справа дайшла да ўзброеных сутычак. Перавагу мелі добра ўзброеныя чэха-славакі. Ім удалося захапіць у свае рукі лінію чыгункі і сумежныя з ёй гарады. 25 мая 1918 г. чэха-славакамі быў заняты Чалябінск, які знаходзіцца на мяжы паміж Уралам і Сібірай. Усьлед за тым у рукі бунтаўнікоў, пры падмозе і кіраўніцтве эсэраў, меншавікоў і буржуазіі, адзін за адным сталі пераходзіць сібірскія гарады. У тым-жа маі м-цы імі былі заняты Нованікалаеўск, Марынск, Канск, Ніжняўдзінск, Петрапаўлаўск, Тайга і Томск, а ў чэрвені—Омск, Курган, Барнаул, Ачынск, Краснаярск, Уладзівасток. У ліпені пала са-

вецкая ўлада ў Іркуцку, Нікольску-Усурыйскім (на Далёкім Усходзе), Сяміпалацінску (у Заходняй Сібіры). У верасьні чэха-славакамі была занята Чыта (Забайкальле), дзе запанаваў чорнасоцены казацкі атаман Сяменаў пры падмозе японскіх імпэрыялістых, якія забясьпечвалі яго з-за граніцы грашыма і ўзброеньнем.

Адначасна з Сяменавым на Далёкім Усходзе ў межах Амурска-Усурыйскага краю арудваў другі чорнасоцены атаман—Калмыкаў. Пры дапамозе тых-жа японскіх імпэрыялістых, якія высадзілі свае войска ва Ўладзівастоку для падтрыманьня расійскіх контррэвалюцыянэраў, ён яшчэ ў сакавіку 1918 г. пачаў зьбіраць узброеныя атрады на станцыі Пагранічнай для змаганьня супроць савецкай улады. У жніўні калмыкаўцамі быў заняты горад Хабараўск.

К гэтаму часу савецкая ўлада ўжо ўпала на ўсёй Сібіры, ад Уралу да Вялікага акіяну.

Чаму гэта здарылася?

Па-першае,—таму, што савецкая ўлада ў той час яшчэ ня мела ў Сібіры рэгулярнай, правільна арганізаванай і абучанай вайсковай справе арміі. Чырвоная армія, якая толькі што нараджалася ў той час у цэнтры Расіі, не магла прысьці на дапамогу сібірскім рабочым, яна змагалася на Паўднёвым фронце з царскімі генэраламі.

Баявой сілай савецкай улады ў Сібіры былі амаль неабучаныя вайсковай справе атрады рабочых-чырвонагвардзейцаў. Гэтым вось атрадам, да таго-ж невялікім, даводзілася весьці змаганьне, якое было ім

не пад сілу, з добра ўзброеным і абучаным ворагам, які ў шмат разоў перавышаў сваім лікам рабочую Чырвоную гвардыю. Адных толькі чэха-славацкіх салдат, у першы час паўстаньня іх супроць савецкай улады, па ўсёй Сібіры налічвалася каля васьмідзесяці тысяч. Да іх далучыліся шматлікія дабрахвотніцкія атрады белагвардзейцаў, з белых царскіх афіцэраў і юнкераў, таксама добра абучаных і ўзброеных. Контррэволюцыю падтрымлівалі і несьвядомае сібірскае казацтва, абдуранае сваімі атаманамі. Сібірская буржуазія і соцыялістычныя партыі—эсэры і меншавікі—з радасьцю віталі выступленьне чэха-славакаў і белагвардзейцаў, як сваіх абаронцаў. Што датычыцца моцнага серадняцкага сялянства, г. зн. пераважнай большасьці сялянскага насельніцтва Сібіры, дык яно, і ў час пераходу ўлады да саветаў, стаяла з боку ад таго, што адбывалася навокал. Сялянская - ж бедната не пасьпела яшчэ зорганізавацца. І гэта бязудзельнасьць сібірскага сялянства ў змаганьні, што адбывалася ў Сібіры за ўладу, было аднэй з галоўных прычын таго, што сібірскія рабочыя ня мелі посьпеху ў змаганьні з контррэволюцыяй. За гэту бязудзельнасьць сялянству Сібіры хутка давялося цяжка адпакутаваць, зазнаўшы на сваёй сьпіне кулацка-атаманскую ўладу.

## Пад сьцягам народнага кіраваньня

На месца нізрынутай савецкай улады ў Сібіры, у горадзе Омску, утварыўся так званы Часовы сібірскі ўрад. У склад яго ўвайшлі эсэры, што фактычна



Ахвяры белагвардзейцаў.

кіравалі паўстаньнем супроць савецкай улады, меншавікі і прадстаўнікі буржуазіі. Гэты ўрад абвясьціў сябе дэмократычным. Гэта быў урад гарадзкіх домаўласьнікаў, прамыслоўцаў, гандляроў і кулакоў. Ён ня толькі не абараняў інтарэсаў народу,—рабочых і сялянскіх мас, але, як мог, прыгнечваў яго.

Урад «народнага кіраваньня» пачаў з таго, што забараніў рабочыя організацыі ў гарадох, профсаюзы, не дазваляў організоўваць сялянскія зьезды. Затое ён ахвотна дазваляў зьезды гандляроў, прамыслоўцаў, духавенства і чорнасоценнага казацтва, адзначаючы яго «асобныя паслугі» ў барацьбе з савецкай уладай. Каб яшчэ больш задобрыць верхаводаў казацтва, яно робіць генэралам організатара зьезду, былога царскага падпалкоўніка Іванова-Рынава, выбранага атаманам сібірскага казацкага войска. Хутка новаспечаны генэрал быў прызначаны вайсковым міністрам і камандуючым сібірскай арміяй. Былы паліцэйскі, заядлы прыхільнік старога рэжыму, Іваноў-Рынаў яшчэ да рэволюцыі быў вядомы сваімі расправамі над рабочымі і сялянамі ў Туркастанскім краі, дзе ён служыў спраўнікам. Аб'явіўшыся затым у Сібіры, гэты «паліцэйскі ярыжка»—так называлі яго за-вочы свае-ж людзі—зрабіўся тут адным з правадыроў контррэволюцыі. Новы вайсковы міністар пачаў з таго, што на другі-ж дзень пасьля свайго прызначэньня ўвёў закон аб аднаўленьні кары сьмерцю (адмененай яшчэ Лютаўскай рэволюцыяй), які і стаў шырока дапасоўваць да ўсіх, каго падазравалі ў «бальшавізьме». Ён знайшоў вартага сабе па-

мочніка, заядлага монархістага і галаварэза, палкоўніка Волкава. Усю Сібір з Прыўральлем і Далёкім Усходам ён падзяліў на паасобныя вайсковыя акругі, прызначыўшы ў іх камандзірамі самых лютых чорнасоценцаў і вешацеляў: у Омску—палкоўніка Волкава, на Урале—атамана Дутава, у Кіргізіі—атамана Аненкава, у Забайкальлі—атамана Сямёнава ды іншых. Усім гэтым бандытам разам з генэральскімі пагонамі было дадзена самае шырокае права «навадзіць парадак», як самі ведаюць, і гэтым правам яны карысталіся ва-ўсю...

Стогнам застагнала Сібір ад гэтых кіраўнікоў. Кожны з іх быў у сваёй «вотчыне» неабмежаваным уладаром—і царом і богам... Ён мог караць і мілаваць каго хацеў, пры чым караў сьмерцю, канешне, усіх западозраных у бальшавізьме, а мілаваў сваіх аднамысных—забойц, рабаўнікоў і спэкулянтаў. Над мірным сібірскім насельніцтвам «вотчыньнікі» омскага ўраду тварылі жорсткі суд і расправу, як хто хацеў, іначай кажучы,—расстрэльвалі, вешалі і можа расправуляліся з ім бяз усякага суду і сьледзтва.

Усе яны былі ў гэтай справе майстры. Але асабліва выдзеліўся сваёй лютасьцю і зьверствам сямірэчанскі атаман Аненкаў.

## Слаўгародзкае паўстаньне

Сялянская Сібір нядоўга заставалася ў баку ад падзей. Вельмі хутка яна пазнала, дзе яе сапраўдныя сябры і дзе ворагі. А пазнаўшы, стала змагацца з

контррэволюцыянэрамі, якія называлі сябе сібірскім урадам. Гэта змаганьне, спачатку неарганізаванае, «партызанскае», высунула сваіх правадыроў—партызанаў. Імёны такіх буйных правадыроў-герояў, як таварышы Шчацінкін, Якавенка, Мамантаў, Караландашвілі, Бураў і іншыя, вядомыя ўсяму працоўнаму насельніцтву Сібіры.

У далейшым партызанскія рухі зьліваюцца ў адзін магутны паток, наладжваюць сувязь з нелегальнымі партыйнымі комуністычнымі цэнтрамі і рабочымі арганізацыямі і падпарадкаваюцца іхняму арганізаванаму кіраўніцтву.

Пачынальнікамі ў гэтым змаганьні былі сяляне Слаўгародзкага павету.

Справа была такая. У жніўні 1918 г. омскі ўрад абвясьціў прызыў у армію. Сяляне, якія і бяз гэтага ўжо былі даведзены да беднасьці імпэрыялістычнаю вайною і страцілі ў ёй шмат сваіх працаўнікоў, не хацелі зноў даваць сваіх сыноў для абароны кулакоў і капіталістых. Ня гледзячы на суровую кару, якую ўрад пагражаў тым, хто будзе ўхіляцца ад мобілізацыі, на прызыў амаль ніхто не зьяўляўся. Омскія выведнікі з вялікай цяжкасьцю лавілі па аднаму, па два прызыўнікі з цэлай вёскі і адвозілі іх у горад, на зборны пункт. А каб прызыўнікі адтуль не разьбягаліся, іх замыкалі ў халодныя, цёмныя і сырыя хлявы, нібы гэта былі ня людзі, а бязмоўны статак. Зноў узьняла сваю галаву залатапагонная афіцэрская зграя, зноў салдатам даводзілася выструньвацца перад ёю, аддаваць чэсьць, велічаць яе «благаро-

дзіямі» і «прэвосхадзіцельствамі», а ў адказ атрымоўваць «тыканьне», мацерную лаенку і зубатычыны. Зноў уваскросьлі адкормленыя фэльдфэбэлі і ўзводныя, з старых царскіх жандараў і гарадавых, якія шчодра кармілі маладых салдат мордабоямі. Усё гэта надта абурала сялян, якія зусім не таго чакалі ад рэволюцыі, і было аднэй з галоўных прычын да выступленьня. Пачатак у гэтай справе зрабіла вёска Чорны Дол, якая знаходзіцца ў трох вярстах ад гораду Слаўгораду. Яна першая адмовілася даваць навабранцаў. Павятовая ўлада рашыла правучыць «бунтаўнікоў», як яна называла чорнадольцаў.

Пачалося з таго, што 28 жніўня ў Чорны Дол зьявіўся з Слаўгораду начальнік гарнізону, капітан Кержаеў, каб прымусіць сялян падпарадкавацца вымаганьням ураду. Ён загадаў сабраць сход і на сходзе абвясьціў, што калі навабранцы зараз-жа ня будуць дастаўлены, дык праз дзень-два ён зноў зьявіцца ў сяло, але ўжо з узброеным атрадам і як сьлед пакарае «бунтаўнікоў». Пагроза гэта, аднак, ні да чаго ня прывяла. Чорнадольцы цьвёрда стаялі на сваём: «Омскага ўраду не прызнаем, таму што яго ня выбралі, ваяваць з бальшавікамі ня хочам і рэкрутаў не дамо». Кержаеў паехаў бяз нічога. Але 1-га верасьня ён зноў зьявіўся ў Чорны Дол,—на гэты раз ужо не адзін, а на чале ўзброенага атраду з афіцэраў, чалавек з трыццаць. Як дзікая зграя разбойнікаў, наляцела кержаеўская банда на бяззбройнае сяло і адразу-ж пачала сваю крывавую расправу.

П'яныя афіцэры распачалі страляніну па вуліцах сяла. Перапужаныя жыхары часткаю разьбегліся і пахаваліся хто куды мог. Тыя, хто пасьмялей, заставаліся на вуліцы, але дорага заплацілі яны за сваю сьмеласьць. Афіцэры хапалі іх і зьбівалі прыкладамі. Стары Бірвашын, які стаяў каля дому, быў расстрэлены. Пяцёра сялян, бацькі навабранцаў, якія не зьявіліся на прызыў, былі арыштаваны кержаеўцамі, як «кіраўнікі» бунту, і адвезены ў горад.

Расправіўшыся такім чынам з «бунтаваўшым» сялом, афіцэрская банда, пасьля шумнага баляваньня, ад'ехала ў Слаўгорад.

Калі яны паехалі, сталі выходзіць з сваіх прытулкаў раззлаваныя і абураныя сяляне. Зьбіраліся сходы, на якіх шчыра абгаварвалася гэта здарэньне. Вёска хвалявалася. У Чорны Дол пачалі зьбірацца сяляне суседніх вёсак, якія праведалі аб тым, што здарылася ў Чорным Доле. Тыя таксама ўзялі шчыры ўдзел у абагаварэньні афіцэрскага налёту. Стала вядома, што ў гэту ноч Кержаеў мае намер расстраляць усіх рэволюцыянэраў, якія сядзелі ў Слаўгародзкім вастрозе. Пачуліся галасы, што гэтай справы так пакідаць нельга, што трэба правучыць налётчыкаў і адбіць у іх арыштаваных. Да гэтых галасоў далучылася большасьць сялян. Сыгнал да паўстаньня быў паданы.

Вырашана было ўзброіцца хто чым можа і ў гэту ноч ісьці ў наступ на Слаўгарад—перабіць там усю афіцэрскую банду і вызваліць арыштаваных. Вестка аб гэтай пастанове маланкаю абляцела ваколіцы. Ста-

лі падыходзіць сяляне з бліжэйшых сёлаў. Паступова сабралося каля паўтары тысячы чалавек. Утварыўся даволі вялікі атрад з удзелам былых франтавікоў, якія ўзялі на сябе кіраўніцтва паўстаньнем. У атрадзе было некалькі вінтовак. Рэшта паўстанцаў узброілася хто чым папала: хто ўзяў сякеру, хто жа-



Бяссонная ноч у рэволюцыйным штабе.

лезную рыдлёўку, хто вілкі, а хто проста пугу... Роўна а поўначы на 2 верасьня атрад рушыўся на Слаўгорад. Думалі захапіць кержаеўцаў зьнянацку, у час сну, перабіць іх і вызваліць арыштаваных. Але да гораду пасьпелі падыйсьці, калі ўжо пачынала днець. Хацелі ўжо адыйсьці і адкласьці свой намер на другі дзень. Але ў гэты час пад'ехалі колёністыя з нямецкай сельскай колёніі, якая знаходзілася недалёка. Даведаўшыся ў чым справа, яны сталі падбадзёрваць

сялян, раілі не адкладваць нападу і абяцалі падтрымаць з боку колёніі. Абяцаньне гэта яны і выканалі.

Горад быў акружаны і захоплены паўстанцамі. Захоплены зьнянацку гарнізон адстрэльваўся, але нятрапна. З боку паўстанцаў страт ня было. Паўстанцамі былі перабіты дваццаць два кержаеўскіх афіцэры, а рэшта ганебна ўцякла, спалохаўшыся дрэнна ўзброеных сялян: «сьмелыя» белагвардзейцы, як заўсёды, былі сьмелымі толькі ў расправе над мірным, бяззбройным насельніцтвам.

Заўладаўшы горадам, паўстаўшыя сяляне, на сходзе ўхвалілі арганізаваць савецкую ўладу ў Слаўгародзкім павеце і ў горадзе.

Для кіраўніцтва рухам паўстанцамі быў арганізаваны рэволюцыйны штаб, начальнікам якога быў абраны т. Фесенка. Апрача яго чынны ўдзел у штабе прымаў сялянін т. Церабіла. Месцазнаходжаньне штабу было перанесена з Слаўгораду ў сяло Чорны Дол, як больш пэўнае месца. Па павету былі разасланы паведамленьні аб організацыі гэткіх-жа штабаў у больш буйных сёлах. Была выпушчана адозва да насельніцтва з заклікам захоўваць парадак. Слаўгорад быў вызвален ад белагвардзейцаў. Для стварэньня больш організаванай улады вырашана было склікаць у Слаўгорадзе павятовы зьезд саветаў. Адчыненьне зьезду было прызначана на 12 верасьня. Зараз-жа былі разасланы запрашэньні на зьезд, і сталі зьбірацца дэлегаты з сёлаў і вёсак Слаўгародзкага павету. Усяго зьехалася да чатырохсот дэлегатаў.

Хутка сталі прыяжджаць для ўстанаўленьня сувязі з слаўгародцамі дэлегаты і з іншых паветаў Сібіры: з Бійску, Барнаулу, Камня, Паўладару і іншых месц. Усе яны гаварылі пра неабходнасьць наступу на іншыя гарады, занятыя белагвардзейцамі, для захопу ўлады. Для гэтай мэты прапаноўвалі правесьці шырокую самамобілізацыю. Сіламі, якія мелі, занялі чыгуначную станцыю Бурла. Паўстаньнем кіравалі



Допыт белагвардзейцаў у штабе Чырвонай гвардыі.

мясцовыя комуністыя. Трэба было слаўгародзкае паўстаньне перакінуць у агульнасібірскую барацьбу працоўных за савецкую ўладу і злучыцца з савецкай рэспублікай.

Слаўгародзкае паўстаньне выклікала вялікую трывогу сярод омскіх уладароў. Вырашана было «прыкладам» пакараць слаўгарадцаў, каб наперад другім непавадна было «бунтаваць». Вайсковы міністар,



Інв. 1933 г. Б#4848
2470

атаман Іваноў-Рынаў, стаў шукаць пэўнага чалавека, які мог-бы з посьпехам выканаць гэту чорную справу. Ён выбраў Аненкава, які быў ужо вядомы, як заядлы контррэволюцыянэр, монархісты і пагромшчык. Яму і даручана было прыдушыць слаўгародзкае паўстаньне.

Над Слаўгорадам навісьлі чорныя хмары навальніцы...

## Як Аненкаў уціхамірваў слаўгародцаў

Аненкаў выбраў з сваіх атрадаў найбольш лепшыя часьці галаварэзаў і рушыўся з імі на ўціхамірваньне слаўгародцаў. На падмогу аненкаўцам прысьпелі з Омску яшчэ два белагвардзейскіх палкі. Усе яны былі добра ўзброеныя і мелі выстарчаючую вайсковую падрыхтоўку. У паўстанцаў-жа ня было ні таго, ні другога.

Даехаўшы па чыгунцы да станцыі Татарск, Аненкаў павёў адсюль наступ на Слаўгорад. Паўстанцы даведаліся аб тым, што ідзе карны атрад з перахопленай тэлефонаграмы. Рэволюцыйны штаб вырашыў даць бойку аненкаўскім гасьцям. Зараз-жа была абвешчана мобілізацыя мужчынскага насельніцтва да саракапяцігадовага ўзросту.

7 верасьня адбылася першая сутычка аненкаўцаў з слаўгародцамі, якая скончылася паражэньнем паўстанцаў. У гэты дзень, раніцаю аненкаўцы занялі пасёлак Гусіная Ляга, дзе імі было перабіта шмат сялян. У той-жа дзень імі быў разьбіты паўстанцкі

атрад каля станцыі Бурлы. Атраду прышлося адыйсьці. Частка паўстанцаў, прыгнечаная няўдачай і пераканаўшыся, што бяз зброі немагчыма змагацца з добра ўзброеным ворагам разышлася па сваіх вёсках. Чалавек трыццаць паўстанцаў здалося ў палон, і ўсе яны былі пасечаны на кавалкі. У бойцы загінуў і начальнік штабу паўстанцаў т. Фесенка.

Але найбольш лютыя, зьвярыныя спосабы расправы з пераможанымі Аненкаў бярог для вёскі Чорны Дол, якая першая ўзьняла паўстаньне і ў якой знаходзіўся галоўны штаб паўстанцаў. Чорнадольцаў ён надумаў люта пакараць.

Раніцою 9 верасьня аненкаўцы пайшлі на Дол. Наступ вёўся па ўсіх правілах вайсковай умеласьці. Вёску спачатку засыпалі дажджом куль, пасьля чаго аненкаўскія малайцы, як дзікія зьвяры, урваліся ў яе... Пачаліся забойствы, гвалты і рабаваньні.

Аненкаў разьлічваў захапіць у Чорным Доле кіраўнікоў паўстаньня, але памыліўся. Рэвалюцыйны штаб загадзя адышоў у глыб тайгі, павёўшы за сабою амаль усё дарослае мужчынскае насельніцтва. Чорны Дол апусьцеў. У вёсцы засталіся адны толькі старыкі, жанчыны і дзеці: сяляне спадзяваліся, што банды іх не зачэпяць. Але аненкаўскія малайцы ня міналі ні старога, ні малога. Раззлаваныя тым, што ім не ўдалося захапіць у вёсцы паўстанцаў, яны перакінулі сваю дзікую помсту на безабаронных і бяззбройных старыкоў і жанчын. У першы-ж дзень яны забілі для пагрозы з дзесятак старыкоў, якія ўцякалі з жанчынамі ў поле хавацца ад налётчыкаў у барсуковых

норах, а жанчын згвалцілі. Увайшоўшы ў сяло, аненкаўцы адразу-ж спакушаліся спаліць яго дашчэнту і падпалілі некалькі хат, але саманныя (абмазаныя глінай) хаткі не загараліся. Тады бандыты пачалі выцягваць і паліць хлеб, рабаваць мужыцкую



Атаман Аненкаў.

маемасьць, забіраць скаціну (рабунак гэты цягнуўся цэлых два тыдні).

На гэтым, аднак, расправа з чорнадольцамі ня скончылася... Пакінуўшы ў Чорным Доле частку свайго атраду, для навядзеньня парадку. Аненкаў у той-жа дзень, каля другой гадзіны, пачаў наступ-

леньне на Слаўгорад. Там таксама не засталося ніводнага ўзброенага чалавека, таму заняць горад было вельмі лёгка. Ня гледзячы на гэта, ўвайшоўшы ў Слаўгорад, Аненкаў паслаў у Омск хвасьлівую тэлеграму аб нібы-та атрыманых ім у Чорным Доле і Слаўгорадзе вялікіх перамогах. Сапраўды-ж гэтыя «перамогі» былі ня чым іншым, як зьвярыным збойствам мірных жыхароў. Заняўшы Слаўгорад, аненкаўцы наладзілі ў ім дзікую крывавую лазьню.

Ахапіўшы горад з усіх бакоў, аненкаўцы бралі ўсіх без разбору, хто трапляўся пад рукі і цягнулі на расправу ў штаб, дзе затрыманых да паўсьмерці білі шампаламі і нагайкамі, а некаторых забівалі на сьмерць.

Выпадкі дзікай нялюдзкай расправы аненкаўцаў з мірным насельніцтвам Слаўгораду, ужо за першы дзень уваходу ў горад, налічваліся дзесяткамі, калі ня сотнямі. Адных білі да калецтва, шмат каго і вельмі шмат засеклі, расстралялі альбо павесілі. У першы-ж дзень гаспадараньня аненкаўцаў у Слаўгорадзе было забіта трыццаць чатыры чалавекі, а на другі—чатырыста семнаццаць...

Асаблівую лютасьць выказаў атаман і яго памочнікі да рэволюцыйных савецкіх працаўнікоў. Аднэю з першых ахвяр бандытаў зьявіўся т. Некрасаў, які быў у 1918 г. вайсковым сьледчым савецкай Чырвонай гвардыі. Яго аненкаўцы разарвалі на часткі. Ня грэбаваў і сам атаман уласнаю рукою распраўляцца з «бальшавікамі» (як ён называў усякага, хто не спачуваў белагвардзейцам). Пераможна ўехаўшы ў

леньне на Слаўгорад. Там таксама не засталося ніводнага ўзброенага чалавека, таму заняць горад было вельмі лёгка. Ня гледзячы на гэта, ўвайшоўшы ў Слаўгорад, Аненкаў паслаў у Омск хвасьлівую тэлеграму аб нібы-та атрыманых ім у Чорным Доле і Слаўгарадзе вялікіх перамогах. Сапраўды-ж гэтыя «перамогі» былі ня чым іншым, як зьвярыным збойствам мірных жыхароў. Заняўшы Слаўгорад, аненкаўцы наладзілі ў ім дзікую крывавую лазьню.

Ахапіўшы горад з усіх бакоў, аненкаўцы бралі ўсіх без разбору, хто трапляўся пад рукі і цягнулі на расправу ў штаб, дзе затрыманых да паўсьмерці білі шампаламі і нагайкамі, а некаторых забівалі на сьмерць.

Выпадкі дзікай нялюдзкай расправы аненкаўцаў з мірным насельніцтвам Слаўгораду, ужо за першы дзень уваходу ў горад, налічваліся дзесяткамі, калі ня сотнямі. Адных білі да калецтва, шмат каго і вельмі шмат засеклі, расстралялі альбо павесілі. У першы-ж дзень гаспадараньня аненкаўцаў у Слаўгарадзе было забіта трыццаць чатыры чалавекі, а на другі—чатырыста семнаццаць...

Асаблівую лютасьць выказаў атаман і яго памочнікі да рэволюцыйных савецкіх працаўнікоў. Аднэю з першых ахвяр бандытаў зьявіўся т. Некрасаў, які быў у 1918 г. вайсковым сьледчым савецкай Чырвонай гвардыі. Яго аненкаўцы разарвалі на часткі. Ня грэбаваў і сам атаман уласнаю рукою распраўляцца з «бальшавікамі» (як ён называў усякага, хто не спачуваў белагвардзейцам). Пераможна ўехаўшы ў

Слаўгорад на аўтомобілі з надпісам: «З намі бог, сьмерць бальшавікам», Аненкаў падкаціў пад будынак, дзе раней часова знаходзіўся рэволюцыйны штаб і дзе былі некаторыя з кіраўнікоў руху—т.т. Лапцеў, Сарокін і іншыя,—што засталіся ў горадзе для падтрыманьня парадку. Седзячы ў аўтомобілі, атаман загадаў вывесьці да яго «бальшавікоў». Вышаўшы да Аненкава, т. Лапцеў памеціўся загаварыць, але ледзь ён раскрыў рот, як атаман уласнаю рукою палажыў яго на месцы стрэлам з рэвольвэра. Рэшту схапілі аненкаўскія казакі і, па загаду атамана, засеклі шаблямі.

Пасьля гэтага Аненкаў даў распараджэньне «зьнішчыць» усіх дэлегатаў, якія сабраліся на зьезд саветаў. Сяляне-дэлегаты, разьлічваючы, што іх, як народных абранцаў, аненкаўцы не пасьмеюць крануць, заставаліся ў горадзе. Але аненкаўскія каты не пашкадавалі і іх. Усе дэлегаты і прыналежныя да зьезду сяляне былі арыштаваны і пакараны сьмерцю...

Каб застрашыць жыхароў, пакараньне дэлегатаў, па загаду атамана, выконвалася ў цэнтры гораду, на пляцы перад будынкам Народнага дому, дзе павінен быў адбывацца зьезд саветаў. Тут крывавы атаман наладзіў лобнае месца для народных абранцаў. Дэлегатаў прыводзілі сюды з турмы партыямі, ад дваццаці да пяцідзесяці чалавек: іх расстрэльвалі, вешалі альбо засякалі шаблямі, а трупы іх тут-жа закопвалі ў адну агульную яму. Так мучальнікамі загінулі ўсе да аднаго дэлегаты зьезду... Сюды-ж, на пляц, анен-



Пахаваньне закатаваных аненкаўцамі сялян. (Сяло Вяселаярскае.—Верасень 1918 г.).

каўскія каты прыводзілі і захвачаных імі сялян з вакольных вёсак, якія ў большасьці ня мелі ніякага дачыненьня да зьезду. Тут іх таксама катавалі, пасьля забівалі. Было павешана і расстрэлена шмат гарадчан, якія зусім ня ўдзельнічалі ў паўстаньні, у тым ліку жанчыны і дзеці. Жанчын і дзяўчат бандыты перш гвалцілі, а пасьля забівалі... Аненкаўскія выведнікі рассыпаліся па ўсім горадзе, ловячы тых, каго падазравалі ў спачуваньні бальшавікам.

І даволі было аднаго неасьцярожнага слова з боку каго-небудзь, каб папасьці ў лапы катаў. Слаўгародзкі рабочы Арлоў—чалавек спакойны і ціхі—ня прымаў ніякага ўдзелу ў паўстаньні, сядзеў больш дома і амаль нікуды не паказваўся. Аднойчы ўвечары заехалі да яго казакі і папрасіліся паначаваць. Арлоў прыняў іх даволі прыветна і запрасіў вячэраць. За сталом казакі, каб выведаць настрой гаспадара, завялі гутарку пра палітыку і заявілі, што яны, аненкаўцы, змагаюцца, «за ўстаноўчы сойм». Арлоў, які дрэнна разьбіраўся ў палітычных пытаньнях, баязьліва заўважыў, што і бальшавікі, як ён чуў, таксама за ўстаноўчы сойм, толькі бяз удзелу ў ім буржуяў. Казакі хітра глянулі адзін на аднаго, і на гэтым гутарка скончылася. Усе пайшлі спаць.

А раніцаю аненкаўскія казакі ўзялі Арлова, яго брата і старога—бацьку, як бальшавікоў, і павялі на расправу. Прывялі ў каталажку—тую самую, дзе сьцены, лаўкі і падлогі былі заліты крывёю катаваных. Тут ужо стаяла вялікая чарга чакаўшых над

сабою расправы (аненкаўцы паставілі іх у чаргу). Паставілі ў хвост і Арловых. Арлову і яго брату загадана было даць па дзьвесьце пяцьдзесят udараў штэмпэлямі, а бацьку іхнаму, як старэйшаму, трыста. Арлова разьдзелі і кінулі на лаўку. Ад першых-жа ўдараў ён закрычаў ад болю. Тады афіцэр, які назіраў за катаваньнем, загадаў казаку:

— Дай яму прыкладам у зубы, каб ня крычаў.

Казак «даў», пасьля чаго Арлоў ужо болей ня крычаў...

Такіх выпадкаў, як з Арловым, былі сотні...

Маленькі гарадок Слаўгорад у працягу першых-жа двух-трох дзён гаспадараньня ў ім аненкаўцаў стаў падобным на могілкі. Усюды трупы, стогны паміраючых, плач асірацелых... Шмат дамоў было спустошана і абрабавана «пераможцамі». Жыхары хаваліся па сваіх дамох і баяліся выткнуцца на вуліцу. На вуліцах гораду стаяла магільная ціша, якая парушалася часамі толькі п'яным крыкам і песьнямі аненкаўскіх афіцэраў і казакаў, ды звонам царквей, дзе папы служылі «благодарственные молебны» з прычыны перамог, атрыманых атаманам над «бальшавікамі».

Скончыўшы з рэвалюцыйным Слаўгорадам, Аненкаў узяўся наводзіць «парадак», гэта значыць забіваць, калечыць і рабаваць сялян у акрузе. Для гэтага па вёсках Слаўгародзкага павету былі разасланы невялікія атрады казакаў з заядлых разбойнікаў і галаварэзаў.

## Пад знакам чэрапа і касьцей

Атрад Аненкава меў сваю, улюбёную атаманам, эмблему, г. зн. знак: мёртвую чалавечую галаву (чэрап) і пад ёю—дзьве скрыжаваных чалавечых косьці. Гэты знак красаваўся і на сьцягу атраду, і на рукавох аненкаўскіх афіцэраў, і на шапках казакаў. Ён паказваў, што дзе ні зьявяцца аненкаўцы, яны ўсюды прыносяць з сабою сьмерць і руйнаваньне: нездарма адзін толькі выгляд гэтага знаку палохаў мірных жыхароў.

Вось што расказваюць тыя, хто бачылі і самі перацярпелі, каму ўдалося выратавацца ад рук аненкаўскіх бандытаў, пра іх зладзействы.

Усюды, дзе толькі зьяўляліся аненкаўцы, адбывалася адно і тое-ж. Раней усяго хапалі ўсіх, хто трапляўся ў рукі, мужчын і жанчын, і катавалі іх. Катавалі нагайкамі альбо штэмпэлямі. Кожнаму давалі па паўтараста, дзьвесьце альбо трыста удараў (а часамі і болей). Катавалі так, што кроў лілася руччамі, скура, а здаралася і мяса, ляцелі з-пад удараў кавалкамі. Часамі, каб зрабіць сваёй ахвяры больш пакут, раны ад удараў пасыпалі сольлю і потым зноў білі па тым-жа месцы. Стогны і крыкі пакутніка толькі павялічвалі заядласьць катаў: яму затыкалі чым-небудзь рот і білі яго з большай яшчэ азьвярэласьцю. Калі катаваны траціў прытомнасьць, яго адлівалі халоднай вадой і зноў катавалі. Часта забівалі гэткім чынам на-сьмерць...

Але катаваньне, з усімі яго мучэньнямі, лічылася ў аненкаўцаў яшчэ невялікаю караю. Выяўленых альбо западозраных хаця-б у самай далёкай прыналежнасьці да паўстаньня (напрыклад, тых, хто хаваў паўстанцаў), чакала страшэнная кара. Ім выдзіралі



Сьцяг атамана Аненкава. На другім баку яго вышыта „З намі бог“.

вочы альбо языкі, адсякалі рукі і ногі, выразалі палосы скуры на сьпіне і на грудзёх. Часамі «для пацехі» прывязвалі катаванага за ногі доўгай вяроўкай да каня і пускалі каня наўзгалёп. Катаваны валокся па зямлі, б'ючыся галавою аб сустрэчныя каменьні і

пні. Пасьля ўсяго гэтага жаху, калі ён яшчэ быў жывы, яго звычайна дабівалі стрэлам альбо ўдарам прыклада ў галаву. Некаторых жыўцом закапвалі ў зямлю. Іншых вешалі на тэлеграфных слупох і мёртвых пакідалі вісець, каб жывыя баяліся... Досыць было звычайнага нагавору з боку мясцовага папа альбо кулака, каб трапіць на гэткія лютыя катаваньні. Разам з западозраным у «бальшавізьме» звычайна люта караліся і ўсе яго блізкія. Разбойнікі не шкадавалі ні старыкоў, ні малых дзяцей. Жанчын, дзяўчат і нават дзяўчынак-подрасткаў гвалцілі, пасьля чаго, у большасьці, забівалі. У нямецкай колёніі, за тое, што яна падтрымлівала паўстанцаў, былі згвалчаны ўсе чыста жанчыны.

Усе гэтыя жахі адбываліся ў вёсках—Чорны Дол, Паўлаўка, Талкунова, Падасінаўка, Катлаваны, у нямецкім пасёлку № 42 і іншых вёсках Слаўгародзкага павету.

Чорнадольскі селянін Цырулька, член сялянскага рэволюцыйнага штабу, злоўлены аненкаўцамі, быў адведзены на станцыю ў арыштанскі вагон. Па дарозе на станцыю яго бесьперастанку білі нагайкамі і штэмпэлямі. Пад арыштам яго страшэнна катавалі, пакуль не замучылі да сьмерці... Яго жонцы, якая нейкім цудам выратавалася ад сьмерці, ледзь удалося адшукаць труп закатаванага мужа, каб пахаваць яго. Калі яна прывезла цела ў сваю вёску, ніхто з аднавяскоўцаў ня мог пазнаць нябожчыка Цырулькі: да таго труп яго быў зьнявечаны. Усё цела нябожчыка было паколата штыхамі і шаблямі. Галава напалову

зьнесена. Нос і вушы адсечаны, язык вырваны з роту, вочы выкалаты. Пальцы на руках былі выламаны, рукі павыкручваны... У тае-ж самае Цырулькі аненкаўцы, заняўшы Чорны Дол, забілі, акрамя мужа, двух братоў, засекшы іх шаблямі, спалілі дом і забралі ўсю маемасьць, чаго-ж не змаглі ўзяць з сабою, пасеклі на кавалкі сякераю і шаблямі. Спалілі хлеб, забралі пару коняй, карову—адным словам, не пакінулі ні кала, ні двара.

У той-жа вёсцы (Чорны Дол) аненкаўскія бандыты скалечылі, пабілі яшчэ шмат народу, зруйнавалі дашчэнту шмат гаспадарак і шмат згвалцілі жанчын, прычым нягоднікі ня міналі і маленькіх дзяўчынак, пачынаючы з дзесяці год.

У маленькай вёсцы Катлаванах аненкаўцамі былі забіты шасьцёра сялян, у ліку іх—дзевяностагадовы дзед Сіўко і яго малодшы ўнук. Стары і юнак, у ліку шасьцярых арыштаваных за спачуваньне бальшавізму, былі зьбіты, пасьля чаго адвезены на калёсах за вёску, у лес—на расстрэл. Тут бандыты загадалі ім уласнымі рукамі капаць для сябе магілы. Перад расстрэлам старога Сіўко страшэнна білі. Каты адсеклі яму пальцы на руках, разьдзерлі рот, разрэзалі на тры часткі грудзі. Унук Сіўко поўзаў на каленях перад катамі, просячы, каб яны раней забілі яго,—так цяжка яму было глядзець на пакуты дзеда. Катаў гэтыя маленьні не кранулі: спачатку быў расстрэлены старык, а пасьля разрыўной куляй забілі і ўнука...

Малюнак катаваньняў і расстрэлаў Сіўко быў настолькі жудасны, што адзін з вачавідцаў яго—Фурман Земскі, які адвозіў Сіўко ды іншых на расстрэл, памёр на месцы ад перапуду...

У вёску Паўлаўку гэтага-ж павету атрад аненкаўцаў пад каманцаю есаула ўварваўся зусім нечакана. Есаул загадаў склікаць сход і запатрабаваў выдачы «бальшавікоў». Сяляне адказалі, што бальшавікоў сярод іх няма. Тады ўсе яны былі выстраены ў рад, пасьля чаго есаул скамандаваў:

— Праз дзевяць дзесятага па чарзе пачынай!

Казакі адлічылі з шэрэнгі кожнага дзесятага і пачалі катаваць. У лік адлічаных папалі і дзьве жанчыны. Катавалі з жахлівай заядласьцю і лютасьцю... Селянін Кавалёў у час катаваньня ня вытрымаў і стаў крычаць ад болю. Пасьля кожнага яго крыку старэйшы кат камандаваў:

— А ну, паддай мацней!

Кавалёў быў зьбіты да паўсьмерці...

У вёсцы Барадуліна загналі адзінаццаць чалавек сялян у возера да калена і тут дабілі іх двума залпамі са стрэльб. Перад гэтай расправаю аненкаўцы, з дзьвюма гарматамі, абкружыўшы Барадуліна, пазганялі нагайкамі ўсё насельніцтва да воласьці, дзе, па звычаю, усіх катавалі.

— Білі да крыві,—расказвае селянін Каралёў.— Адкатавалі мяне раз. Падышоў начальнік, паглядзеў і кажа: «Гэтаму трэба яшчэ дадаць. Дадалі яшчэ. Я папрасіў вады напіцца. Але замест вады мяне зноў

напаілі бізунамі. Потым выкінулі мяне, як шчаня з кругу катаваньня. Бацьку майго білі тры разы, а пасьля расстралялі».

Часамі аненкаўцы зьяўляліся ў вёскі з чырвонымі сьцягамі, выдаючы сябе за чырвонаармейцаў і шукаючы тых, хто спачувае савецкай уладзе. Выглядалі, падслухоўвалі і хапалі западозраных. Арыштаваных бязьлітасна катавалі. Быў выпадак, калі адзін з арыштаваных папрасіў напіцца. Яму адрэзалі язык, а пасьля ўлілі ў рот гарачай вады...

Шмат яшчэ чаго можна было-б расказаць аб тым, як уціхамірваў атаман Аненкаў слаўгародзкіх сялян,—ды ўсяго не перакажаш. Два тыдні ішло «ўціхамірваньне» павету, і за гэтыя два тыдні ім было забіта і закатавана тут да тысячы сямісот чалавек сялян, а зьбіта і пакалечана ў пяць разоў болей. Трэба сказаць, што павет—невялікі і насельніцтва тут ня вельмі густое. Шэраг вёсак было спалена амаль дашчэнту. Насельніцтва абрабаванае, даведзенае да жабрацтва. Акрамя шматлікіх рабункаў слаўгародзкіх сялян аненкаўцамі, акрамя шкоды, якую панесьлі сяляне ад пажараў і руйнаваньня гаспадарак,—Аненкаў яшчэ абклаў усе вёскі, якія прымалі ўдзел у паўстаньні, вялікай контрыбуцыяй (данінай). Асабліва вялікая контрыбуцыя—трыста тысяч залатых рублёў—накладзена на вёску Чорны Дол, як на галоўнае гняздо «бунтаўнікоў». Контрыбуцыя бралася грашыма, жывёлаю і прыпасамі (хлебам, фуражом). Абкладаліся ёю, канешне, не адны толькі багатыры, а ўся вёска цалкам; вось чаму галоўны цяжар

яе прыпадаў на беднату. У беднякоў адбіраліся за няплату апошнія падушкі і самавары...

Расправіўшыся з бунтарскім паветам, заліўшы яго крывёю, спустошыўшы і зруйнаваўшы дашчэнту, Аненкаў абвясьціў мобілізацыю таго, што засталося мужчынскага насельніцтва. Тыя з сялян, хто мог і пасьпеў, загадзя разьбегліся, схаваўшыся да часу ў няпрыступнай сібірскай тайзе. Хто-ж застаўся ва ўчэпістых лапах аненкаўцаў нехаця пайшоў на зборныя пункты, бо іначай пагражалі расстрэлам. Залучыўшы такім чынам у белую армію да адзінаццаці тысяч чалавек, Аненкаў пагнаў іх на Уральскі фронт супроць савецкай арміі (па дарозе многа іх потым разьбеглася). Частку прымусам узятых навабранцаў Аненкаў паказаў у дакумантах, як добраахвотнікаў. Пасьля ўсяго гэтага атаман паслаў у Омск даняленьне, што Слаўгародзкі павет уціхаміраны прызнаў сібірскі ўрад і даў у шэрагі белай арміі некалькі тысяч байцоў. У адказ на гэта вайсковы міністар атаман Іваноў-Рынаў надаў Аненкаву генэральскую годнасьць (з палкоўнікаў), узнагароду за яго гарлівасьць пры ўціхамірваньні слаўгародзкага бунту. Акрамя таго, Аненкаў атрымаў павышэньне па службе, ён быў прызначаны камандзірам дывізіі.

Акрылены такім заахвочваньнем для далейшых спраў у тым-жа родзе, крывавы атаман з сваімі бандамі ў канцы верасьня 1918 г. накіроўваецца да месца новага свайго прызначэньня, у Сяміпалацінскую і Сямірэчанскую губэрні, каб і там навесьці гэткі-ж парадак, які ён навёў у Слаўгародзкім павеце.

# Сяміпалацінскія зьверствы

Аненкаў прыехаў са сваімі часьцямі ў Сяміпалацінск, дзе яшчэ да яго прыезду савецкая ўлада была нізрынута белагвардзейцамі пры дапамозе чэхаў, і ўзяўся за расправу з мірным насельніцтвам, уся віна якога была ў прызнаньні савецкай улады.

Расправа, як звычайна пачалася арыштамі западозраных у бальшавізьме і ліквідацыяй тых «бальшавікоў», якія ўжо сядзелі ў Сяміпалацінскім вастрозе. Па вечарох, як толькі сьцямнее, аненкаўцы выводзілі з вастрогу арыштаваных групамі па дваццаць-трыццаць чалавек і адвозілі іх за горад у пяскі. Тут іх расстрэльвалі і закапвалі.

На вуліцах гораду хапалі вінаватага і невінаватага. Расправа была вельмі кароткая. Людзей білі галавой аб сьцяну, білі штэмпэлямі па твары, секлі шаблямі альбо кідалі жывымі ў раку.

На аднэй вуліцы выпадкова сабралася некалькі рабочых, якія гаварылі адзін з адным пра свае справы. На іх наляцеў конны разьезд аненкаўцаў і ўсіх іх пасек на кавалкі...

Незадоўга да адыходу з Сяміпалацінску Аненкаў даў загад: «Расстрэльваць усякага, хто асьмеліцца абразіць каго-небудзь з афіцэраў альбо казакаў атраду, *хоць-бы толькі поглядам*».

Сяміпалацінцы, само сабою зразумела, баяліся глядзець на аненкаўскіх бандытаў нават з вакон...

Наводзячы такім чынам «парадак» у самым Сяміпалацінску, Аненкаў стаў «чысьціць ад бальшаві-

коў» (як ён любіў гаварыць) і паветы Сяміпалацінскай губэрні. Асабліва дзікія расправы былі зроблены ім ў гарадох—Усьць-Каменагорску, Сергіополе і сёлах: Троіцкім, Нікольскім, Знаменцы і Шэмо-



Атаман Аненкаў і начальнік яго штабу Дзянісаў—з прадстаўніком англа-амэрыканскай буржуазіі.

наісе, а таксама ў шэрагу аулаў, населеных кіргізамі-казакамі. Тут былі зьнішчаны сотні і тысячы сялян і тубыльцаў, прычым са зьвярынаю лютасьцю забіваліся нават маленькія дзеці. Зьнішчаліся цэлыя селішчы і рабіліся тыя-ж нясьцерпныя зьдзекі над жывымі людзьмі, што і ў Слаўгорадзе: масавыя катаваньні, збойствы і г. д. Людзей катавалі групамі, па

некалькі чалавек запар, пад дзікія сьпевы хору, які сьпяваў пахабныя песьні. Жанчын і дзяўчат гвалцілі па некалькі чалавек адну. Тым, каго чакала хуткая сьмерць, стараліся рабіць як мага больш мучэньня: адсякалі па аднэй назе і руцэ, разразалі грудзі альбо жывот і ўжо потым, калі няшчасны заплываў крывёю, дабівалі яго... Адобранае ў маткі груднoе дзіця бандыты саджалі на штых і жыўцом кідалі яго ў агонь...

Найбольш важныя, па думцы Аненкава і яго штабу, арыштанты звозіліся ў Усьць-Каменагорск, дзе ў старой цытадэлі была зроблена для іх праўдзівая катавальня. Адміністрацыя астрогу катавала арыштантаў і расстрэльвала іх у калідорах астрогу бяз усякага суду і сьледзтва. Расстрэльвалі часта проста для забавы, каб пацешыцца: прыходзіць у астрог п'яны натоўп калчакаўскіх афіцэраў, выбірае, які чым-небудзь не спадабаўся, арыштанта і тут-жа ў калідоры, каля дзьвярэй камеры, прыкончыць яго... Альбо здасца нагляднiку, што які-небудзь з выгнаных на працу арыштантаў ня вельмі старанна чысьціць клёзэт—вінтоўку на прыцэльнік, і няшчасны падае мёртвы з куляю ў патыліцы. Адзін такі выпадак быў перад самым наведваньнем вастрогу атаманам (у кастрычніку 1918 г.). Аненкаў, даэнаўшыся пра забойства, толькі пахваліў нагляднiка.

Усё, што рабілася ў Усьць-Каменагорскай турме да гэтага дня, было, можна сказаць, толькі кветкамі, а ягадкі насталі з дня наведваньня турмы Аненкавым. Пачалося са збойства зьняволеных самым атаманам.

Зьявіўшыся ў вастрог, ён загадаў выстраіць перад ім ўсіх арыштаваных у шырэнгу. Абходзячы арыштаваных, ён пытаўся кожнага з іх аб соцыяльнай прыналежнасьці, прычым рабочых і сялян шчодра абсыпаў ударамі. Аднаму дасьць аплявуху, другога агрэе нагайкай па твары, трэцяга—ботам у жывот. Арыштаванаму Кулігіну расьсек галаву і шмат каго яшчэ пакалечыў. Зьбіўшы такім чынам чалавек пятнаццаць, зьвер-атаман узяўся за адбор найбольш небясьпечных, на яго думку, бальшавікоў. Выбраўшы дваццаць восем чалавек, ён загадаў адвесьці іх на яго параход, каб даставіць іх у Сяміпалацінск—як ён заявіў—«на паказ».

Пасьля ад'езду Аненкава жыцьцё зьняволеных у Усьць-каменагорскім вастрозе стала яшчэ больш нясьцерпным. Аненкаўцы, ледзь ня штодзённа, урываліся ў камеры і выводзілі арыштантаў на расстрэл. Арыштаваных усіх пагалоўна катавалі шэсьць разоў на тыдзень у працягу ўсёй зімы. Такі-ж люты рэжым, які ня спыняўся вельмі доўгі час, урэшце, выклікаў паўстаньне зьняволеных, якое было з дзікаю жорсткасьцю прыдушана. З двухсот пяцідзесяці чалавек паўстаўшых засталося жывымі ня больш дзесяці,—рэшта былі перабіты і расстрэлены.

Ня лепшая доля чакала і тых, каго павёз Аненкаў у Сяміпалацінск. На параходзе яны былі запёрты ў душны і цёмны трум (спод карабля). Дарогаю арыштаваных білі і катавалі. Двое з іх—Антонаў і Емшанаў—былі кінуты жывымі ў параходную печку. Ча-

самі каты адчынялі люк і гралі над ім пахавальны марш. Зьверху яны крычалі арыштаваным:

— Слухайце ў апошні раз, гэта для вас мы граем!

Калі параход прышоў у Сяміпалацінск, усіх арыштаваных перавялі на станцыю чыгункі і тут заперлі ў халодны таварны вагон, адабраўшы ў іх верхняе адзеньне, не давалі есьці. Быў лістапад, трашчэлі суровыя сібірскія маразы, сыпаў сьнег, але вагон не апальваўся. Арыштанты мерзьлі і галадалі. Гэтак было цэлы тыдзень. Пасьля, аднойчы ўвечары, адабралі ўсе рэчы, загадалі зьбірацца і пад строгім канвоем («чорных гусараў») павялі ў затон, на раку Іртыш. Па дарозе залучылі да іх яшчэ нейкіх двух яўрэяў, якіх падазравалі ў бальшавізьме. Іртыш з берагоў ужо даволі падмерз. Арыштаваных падвялі да вялікай палонкі, загадалі ім разьдзявацца да-гала і скакаць у ваду. Па краёх стаялі канвойныя з агаленымі шаблямі, а ззаду—афіцэр з наганам і вінтоўкаю.

Першым скокнуў у ваду чырвоны камандзір, былы афіцэр старой арміі. Вада была яму толькі да пояса, і ён крыкнуў:

— Няглыбока!

Тады сьпехам прадзяўблі шырокую проламку далей ад берагу. Да гэтай проламкі паводзілі арыштаваных па аднаму. Тых, хто не адважваўся ныраць пад лёд, канвойныя секлі шаблямі, а начальнік атраду страляў ў патыліцу. Астатнія арыштанты, у аднэй бялізьне назіраючы, як гінуць іх таварышы, моўчкі чакалі сваёй долі. Двое з іх, сяляне Самборскі і Сурыкаў (апошні—старык, гадоў семдзесят), скары-

стаўшы з моманту, калі афіцэр перанабіваў вінтоўку, кінуліся бегчы. На ўздагон за імі было дадзена некалькі залпаў, але дзякуючы цёмнаму вечару ім усё-ж удалося ўцячы (Сурыкаў застудзіўся і паўгода праляжаў у пасьцелі). Рэшта загінула ў ледзяной вадзе Іртыша...

Распраўляючыся з арыштаванымі, аненкаўцы не пакідалі ў спакоі і насельніцтва. У горадзе Сергіополі імі было павешана, засечана і расстрэлена больш за восемсот чалавек. Большая частка гораду была спалена. Маемасьць жыхароў рабавалася.

У сяле Знаменскім, 45 вёрст ад Сяміпалацінску, выразана амаль усё насельніцтва. Мужчын, перад забойствам, білі, жанчын гвалцілі. Маемасьць і жывёлу рабавалі.

Сяло Троіцкае, Усьць-Каменагорскага павету, за спробу сялян арганізаваць узброенае паўстаньне спалена амаль дашчэнту. Забіта і расстрэлена больш за сто чалавек мужчын, трынаццаць жанчын і сямёра малых дзяцей.

І тут катаваньне, рабункі, гвалтаваньне...

У сяле Нікольскім зьбіта трыста чалавек, расстрэлена трыцаць, павешана пяцера. Павешаныя пакінуты вісець на слупох, для застрашэньня жывых. Шмат дамоў у сяле спалена, скаціна забрана, маемасьць расьцягнута.

У вёсцы Барадулісе, па даносу папа Раждзесьцьвенскага, расстрэлена адзінаццаць сялян. Усіх чыста мужчын катавалі. Жанчын білі прыкладамі і гвалцілі. Тое-ж самае—у вёсках Залатусе і іншых.

Але ледзь ня болей за іншых пацярпела сяло Шэмонаіха. Тут паўтарылася слаўгародзкая гісторыя... Калі Аненкаў у кастрычніку 1918 г. абвясьціў прызыў навабранцаў для папаўненьня сваёй дывізіі, сяляне захваляваліся. Агульны голас быў за тое, каб не даваць



Група аненкаўцаў „на адпачынку“. Пасьля аднэй з крывавых расправ.

людзей. Але каб Шэмонаісе ў гэтым выпадку не застацца аднэй, вырашана было выслухаць думку і іншых вакольных сёлаў і вёсак. Насьпех сабралі ў Шэмонаісе дэлегатаў ад суседніх сёлаў і вёсак. Дэлегатамі аднагалосна было ўхвалена: навабранцаў не даваць і, ў выпадку неабходнасьці, адстойваць гэту пастанову са зброяю ў руках. Супроць такой пастановы галасаваў толькі адзін міліцэйскі Колабаў, рэшта стаялі за паўстаньне, у тым ліку нават поп

Дуплякоў, дэлегаваны на зьезд сялянамі вёскі Нова-Шульбінскай. Хутка ў Шэмонаіху зьявіўся ўзброены атрад аненкаўцаў і ўзяўся за расправу. Але на гэты раз аненкаўцам мала давялося пагаспадарыць. Пад кіраўніцтвам салдат-бальшавікоў, якія вярнуліся з нямецкага фронту (у ліку іх быў сын папа Дуплякова), былі арганізаваны сялянскія атрады і штаб. Узброеныя чым папала, сяляне напалі на добра ўзброеных бандытаў і прагналі іх, страціўшы забітымі ў сутычцы пяць чалавек.

Тады на ўціхамірваньне паўстанцаў з Сяміпалацінску былі кінуты адборныя сілы аненкаўскай дывізіі. Паўстанцы стойка супраціўляліся, але доўга пратрымацца не маглі. Пасьля некалькіх сутычак з бандытамі сялянскія атрады былі разьбіты. Пачалася дзікая расплата...

Раней за ўсё расправіліся з палоннымі, узятымі ў час першага бою. Усе яны, семнаццаць чалавек, былі з зьвярынай лютасьцю забіты. У ліку іншых быў захвачаны і пасечаны на кавалкі і арганізатар сялянскіх атрадаў, франтавік Дупляков.

Перамогшы паўстанцаў, аненкаўцы ўзяліся распраўляцца з бяззбройным насельніцтвам. У Шэмонаісе аненкаўцамі было расстрэлена і пасечана шаблямі чалавек сорак. Палова насельніцтва было біта нагайкамі і штэмпэлямі. Іншых білі шашкамі і стрэльбавымі прыкладамі. Мужчын катавалі, высморгваючы ў іх вусы і барады разам з мясам. Жанчын зьбівалі і гвалцілі. У сялянкі Сырамятавай на яе вачох засечаны муж і сын. У сялянкі Новікавай рас-

стрэлены муж, сама-ж яна згвалчана чатырма бандытамі.

Такім лютым распраў у Шэмонаісе былі дзесяткі. Шукалі папа Дуплякова, каб расправіцца з ім, але той пасьпеў схавацца. Тады схапілі яго жонку і да няпрытомнасьці білі яе нагайкамі, а дваіх маленькіх дзяцей зрабілі на ўсё жыцьцё калекамі... Урэшце, выбралі шаснаццаць чалавек, вывялі за вёску і загадалі ім бяз нічога, голымі рукамі, капаць сабе яму. Толькі яны нахіліліся да зямлі, як над іх галовамі заблішчэлі шаблі: усе былі засечаны...

У сяле Паўлаўскім, Пасьпеліцінскага раёну, аненкаўцы перакатавалі ўсё насельніцтва, расстралялі адзінаццаць сялян і нарэшце падпалілі вёску з усіх бакоў, пасьля чаго паехалі сьпяваючы песьню: «На работу, кума».

Шмат яшчэ чаго можна было-б расказаць пра зьверствы аненкаўцаў у Сяміпалацінскай губэрні, але і гэтага даволі... Губэрня была зруйнавана і абрабована да ніткі.

Сам атаман Аненкаў быў рабаўнікам і гвалтаўніком ня меншым за другіх. Толькі ён браў буйнейшыя кавалкі. Перад адыходам з Сяміпалацінску ён, з некалькімі падручнымі, зьявіўся ў сяміпалацінскі банк і абрабаваў яго на некалькі мільёнаў рублёў, гаворачы, што грошы гэтыя, быццам, пабраны для абмундзіроўкі яго дывізіі. На справе-ж ён прысвоіў гэтыя грошы сабе. Пазьней, калі Аненкаў зьбег у Кітай, ён трымаў іх на сваім бягучым рахунку ў Чугучацкім банку.

## Па прыкладу атамана Аненкава

Не адны толькі слаўгародцы і сяміпалацінцы не хацелі прызнаваць улады самазваннага сібірскага ўраду. Адмаўлялася прызнаваць яго і сялянства іншых сібірскіх мясцовасьцяй. І не адзін толькі атаман Аненкаў уціхамірваў непакорных сялян. Былі ў Омскіх кіраўнікоў для гэтай мэты яшчэ каты і крывавыя сабакі, якія дзейнічалі па прыкладу Аненкава.

Кулацка-эсэраўскі омскі «ўрад» стараўся ўсякімі шляхамі і спосабамі дабіцца прызнаньня з боку сялян, правільна ўлічваючы, якою вялікаю сілаю зьяўляецца сялянства Сібіры. Імкнуўся ён спачатку, акрамя пагроз і распраў дзейнічаць задобрываньнямі і абяцанкамі. Выпускаў вялікія адозвы з рознымі прынаднымі лёзунгамі накшталт установчага сойму і да гэтага падобнае. Але на гэта сяляне не пайшлі. Спробаваў ён сялянства і па кішэні і па жывату, абмяжоўваючы выдачу харчаваньня непакорным вёскам і сёлам. Так, у ліпені 1918 г. усім упаўнаважаным па харчаваньню і саюзам коопэратываў было загадана дастаўляць харчаваньне і тавары толькі тым сельскім грамадам, якія пададуць прыгавары аб прызнаньні імі ўлады сібірскага ўраду.

Але і гэта не дапамагло. Большасьць працоўнага сялянства на сваіх грамадзкіх сходах выносіла прыгавары: «Омскага ўраду не прызнаваць, не даваць яму ні салдат, ні коняй і не плаціць падаткаў». У такія непакорныя мясцовасьці пасылаліся з Омску карныя атрады з афіцэраў, казакаў і чужаземных

салдат (былых вайсковых палонных) і пачыналася лютая расправа...

«Карацелям» загадвалася: лавіць дэзэртыраў, зьбіраць з сялян падаткі, рэквізаваць у іх жывёлу, адбі-




Адзін з колчакоўскіх сьцягаў, захваченых Чырвонай арміяй. Як відаць з вышытых на ім надпісаў і крыжа,—крывавыя расправы над мірным насельніцтвам тварыліся з бласлаўленьня царквы.

раць зброю і рэчы, а галоўнае—прыдушваць бунт. Для гэтай мэты начальнікам атрадаў давалася права (загадам генэрала Іванова-Рынава ад 6 верасьня 1918 г.) арудаваць «по усмотрению». І яны арудавалі.

Звычайна рабілася так: прыяжджае ў сяло карны атрад. Калі ў яго няма загадзя складзенага дагодлівым папом альбо кулаком сьпісу «бальшавікоў», то ён склікае сельскі сход і прапануе «добраахвотна» выдаць бунтаўнікоў. Сяляне звычайна ніколі не выдаюць. Тады пачынаецца катаваньне. Катуюць, як скажа начальнік атраду,—і праз аднаго, і праз трох, і праз пяцёх, а то і ўсіх разам. Адным словам, як уздумаецца. Потым прызнаных вінаватымі ў супраціўленьні ўладзе вешаюць альбо расстрэльваюць...

Каралі за нішто. У аднаго знойдуць у доме салдацкую шынэль, значыць—«бальшавік»: ідзі на расплату. У другога няма крыжа на шыі альбо абраза ў хаце—тое самае. Трэці кнігі чытае, «больно грамотен», караюць і за гэта—і так без канца.

У жніўні і верасьні 1918 г., акрамя Слаўгародзкага павету і Сяміпалацінску, сялянскія паўстаньні, арганізаваныя партыйнымі ячэйкамі на мясцох, ахапілі Курганскі, Бійскі, Зьмяінагорскі, Кузьнецкі, Каменьскі, Канскі, Ніжняудзінскі і некаторыя іншыя паветы Сібіры, аж да далёкага паўночнага Бодайбо.

У некаторых мясцовасьцях, напрыклад, у Зьмяінагорскім павеце, паўстанцамі былі амаль цалкам зьнішчаны ўсе, якія прышлі да іх, карныя атрады, за што яны хутка панесьлі суровую кару.

У канцы кастрычніка ўзьнялося паўстаньне ў Марыінскім павеце, якое ахапіла сем валасьцей. Амаль у адзін час у Томску паўсталі салдаты—навабранцы Марыінскага пяхотнага палка.

Усе гэтыя партызанскія паўстаньні люта прыдушваліся катамі омскага ўраду.

Начальнік Бійскага карнага атраду, капітан Сатунін, які расстраляў шмат сялян, прымусіў некалькіх культурных працаўнікоў вёскі (дактароў, інструктароў, настаўнікаў), западозраных ім у «бальшавізьме», «закапаць саміх сябе» ў зямлю.

Генэрал Іваноў-Рынаў, якому паведамілі аб гэтым, ня толькі не знайшоў у дзеяньнях Сатуніна нічога злачыннага, але, наадварот, узнагародзіў яго і даў павышэньне «за выдатныя паслугі перад бацькаўшчынай»...

У сяле Возера-Курэйскім, Бійскай акругі, былі павешаны на рынку сакратар і члены валаснога земства за тое, што ў земскай управе быў знойдзены стары, што захаваўся ад Лютаўскай рэволюцыі, чырвоны сьцяг.

У той-жа воласьці былі перавешаны ўсе былыя матросы і салдаты запасных палкоў, проста таму, што начальніку атраду не падабаліся матросы і салдаты.

— Раз матрос ці запасны, значыць—бальшавік...

У сяле Круціха, Каменьскага павету, атрадам паручыка Гальдовіча былі расстрэлены сяляне за тое, што ня ўмелі пець «божа, цара храні». Той-жа Гальдовіч і другі карацель Каменскага павету—атаман Бясьсьмертны,—якія замучылі і забілі тысячы сялян, прымушалі іх перад расправаю станавіцца на калені і пець сабе адходную, а маладых жанчын і дзяўчат

гвалцілі першымі, пасьля чаго аддавалі іх на «пацеху» сваім «добраахвотнікам».

У адным сяле Зьмяінагорскага павету была катавана і расстрэлена цэлая сялянская сям'я за тое, што на абед карнаму атраду была заколата хворая, на думку атраднікаў, сьвіньня.

У сяле Чумае, Марыінскага павету, і ў сумежным з ім раёне былі павешаны сотні сялян толькі за тое, што яны, па словах папа, «рэдка наведвалі царкоўныя набажэнствы». Там-жа было расстрэлена некалькі чалавек за тое, што адмовіліся і няўмелі «пороть шомполами».

Было шмат і іншых фактаў лютага і бяссэнсавага зьнішчэньня сялян «усьмірыцелямі». Нечага і гаварыць пра тое, што «усмирение» праходзіла з рабункам маемасьці, падпалам дамоў і цэлых вёсак, словам—з усім тым, што звычайна ўжываецца белабандытамі пры нападзе на мірных жыхароў.

Гэтак стаяла справа ў вёсках. А ў гарадох каты самазванага ўраду душылі рабочыя і партыйныя арганізацыі. Лавілі і кідалі ў вастрог сотні і тысячы барацьбітоў за рабоча-сялянскую справу. Аддавалі іх на лютыя мучэньні і сьмерць.

Загнаныя ў глыбокае подполье пасьля пагрому, зьнясіленыя стратай лепшых таварышоў і кіраўнікоў, якія загінулі ахвярамі лютай кары, катаваньняў, альбо пакутуюць у вастрогах, арганізацыі гэтыя не пасьпелі сабраць раскіданыя і загнаныя сілы і даць арганізаваны адпор гвалтаўнікам. Толькі захаваная напалову арганізацыя чыгуначнікаў, пад ідэйным і

арганізацыйным кіраўніцтвам бальшавікоў, пасьпела правесьці забастоўку чыгуначных рабочых і служачых. Абвешчаная ў пачатку кастрычніка (1918 г.), як протэст супроць лютых расправаў з сялянамі і рабочымі, забастоўка хутка ахапіла ўсе чыгункі Сібіры. Але яна нядоўга цягнулася і яшчэ больш павялічыла колькасьць ахвяр. Бяззбройным чыгуначным рабочым цяжка было змагацца з добра ўзброенымі ўрадавымі бандамі і дапамагаўшымі ім чужаземнымі атрадамі, якія гаспадарылі ў паласе чыгункі.

Забастоўка была жорстка прыдушана. Атаман Красільнікаў, які кіраваў расправаю, празваны за сваю лютасьць Малютай, уласнаю рукою катаваў і расстрэльваў рабочых... Сотні рабочых былі расстрэлены і павешаны. Тысячы іх кінуты ў сібірскія вастрогі, перапоўненыя і бяз гэтага зьняволенымі-рэвалюцыянэрамі.

А арышты ня спыняліся. Арыштаваных ня было куды зьмяшчаць. І вось омскі вешацель, Іваноў-Рынаў, разам з трыма сваімі таварышамі па працы: палкоўнікам Волкавым, Катанаевым і атаманам Красільнікавым, выпрацоўваюць зьвярыны плян разгрузкі сібірскіх вастрогаў.

Плян заключаўся ў тым, каб спровокаваць альбо наўмысьле выклікаць зьняволеных на абурэньне супроць вастрожнага начальства і потым перабіць іх, як бунтаўнікоў.

Гэты подлы плян і быў выкананы.

Усім начальнікам гарнізонаў буйных гарадоў Сібіры быў дадзены з Омску сакрэтны загад: выклі-

кацъ палітычных зьняволеных на «паўстаньне» і пры ўсьмірэньні расстраляць іх. З гэтай мэтай у некаторыя вастрогі былі падасланы спэцыяльныя провокатары, якія падрыхтавалі «бунт» зьняволеных. Закіпела агідная праца. І вось у цэлым шэрагу гарадоў:



Трупы партызан, павешаных калчакоўцамі на тэлеграфных слупох, удоўж лініі Сібірскай чыгункі. Траплялися гэткія месцы, дзе на кожным слупу вісеў чалавек, і часамі вешалі і па два адразу.

у Екацярынбургу, Чалябінску, Табольску, Сяміпалацінску, Омску, Каінску, Нованікалаеўску, Томску, Марыінску, Краснаярску, Іркуцку і іншых, за кароткі час, з 1 да 12 лістапада, былі організаваны «паўстаньні» зьняволеных. У выніку тысячы палоньнікаў буржуазіі былі пасечаны і расстрэлены на месцы, а тыя, што захаваліся, былі аддадзены вайскова-палявому суду за зроблены, нібы-та, імі напад на

органы ўлады, а потым павешаны. Гэтак вастрогі былі разгружаны для прыёму новых палоньнікаў.

Атаманаўская Сібір спраўляла крывавы баль...

## Запанаваньне чорнага адмірала

У той час як атаман бандытаў Аненкаў і яго супрацоўнікі жорстка распраўляліся з безбаронным насельніцтвам сёлаў і гарадоў, у Омску адбылася буйная падзея. Тут зьявіўся самазваны «найвышэйшы кіраўнік» царскі адмірал Калчак, у рукі якога і перайшла ўся ўлада.

Было гэта так.

Чорнасоценна-эсэраўскі «сібірскі ўрад» ужо з першых-жа крокаў адчуваў усю хісткасьць і нятрываласьць свайго становішча. Ён, як і трэба было чакаць, не карыстаўся ніякім давер'ем у насельніцтва. Працоўныя масы Сібіры—сяляне і рабочыя—ставіліся да яго варожа, як і павінна было быць. Урад стараўся абаперціся на групы гарадзкіх гандляроў і дамаўласьнікаў (буйных фабрыкантаў і заводчыкаў у Сібіры амаль няма), на чыноўнікаў і на вясковых кулакоў. Але і гэтая кляса дробных уласьнікаў ня вельмі давярала омскім кіраўнікам; яна скрыва паглядала на ўрадавых соцыялістых, хоць апошнія і стараліся шчыра служыць ёй. Без апоры колькінебудзь значнага пласту насельніцтва, омскі ўрад быў мізэрны і бясьсільны. На справе кіраваў краем ня ён, а кучка атаманаў ды іншых вайсковых бандытаў, на чале са сваім «бацькам», атаманам Івановым-

Рынавым. Гэта кучка рабіла што хацела, тварыла ўсякія непарадкі і беззаконнасьці, застаючыся зусім бяскарнаю. Ня толькі ў далёкіх паветах, але і ў тагочаснай сталіцы Сібіры—горадзе Омску,—пад носам ураду, кучка п'яных афіцэраў, на чале з начальнікам гарнізону, падпалкоўнікам Волкавым, адкрыта разбойнічала, забіваючы тых, якія не падабаліся ёй, асоб, арганізавала тут саюз монархістых і прымушала музыкаў выконваць у рэсторанах царскі гімн, а публіку—уставаць у час яго выконваньня. Тым, хто не ўставаў, пагражала сьмерць.

У самым урадзе ня было поўнага адзінадушша. Склад яго, у огуле, быў вельмі пярэстым. Былі тут і эсэры, і, меншавікі, і прадстаўнікі буржуазных груп і беспартыйныя інтэлігенты. Большая частка ўраду, на чале якога быў міністар фінансаў Іван Міхайлаў (празваны ў Сібіры за сваю пагромную дзейнасьць Ванькай-Каіным), адкрыта спрыяла бандытызму атаманаў і сваволі афіцэраў, разьлічваючы на падтрыманьне вайсковай зграі, калі гэта трэба будзе. За адно з гэтай «правай» групай на справе была і большасьць «соцыялістых», якія сядзелі ва ўрадзе, на чале з міністрам-старшынёю эсэрам Валагодзкім. Але яны ўважалі за лепшае чужымі рукамі жар заграбаць: рабілі выгляд, што ня бачаць ні бандытызму атаманаў, ні непарадкаў афіцэраў, ні рабункаў, і згаджаліся з усёй беззаконнасьцю, якую тварылі тыя і другія, аж да зьнішчэньня цэлых вёсак.

Нарэшце былі сярод сібірскіх міністраў трое-чэцьвера, якія ня страцілі сораму і сумленьня. Адзін з іх

яшчэ раней сам падаў у адстаўку, не жадаючы, па яго словах, «браць на сябе адказнасьць за непарадкі атаманаўшчыны, драпежніцтва спэкулянтаў і саботаж узьняўшых галовы царскіх чыноўнікаў. Па яго словах, урад гэты зьяўляўся бандай крымінальных злачынцаў і злодзеяў». Астатнія трое «левых» міністраў заставаліся ва ўрадзе, бясьсільна протэстуючы супроць беззаконнасьцяй навокал і спрабуючы абаперціся на сібірскую краёвую думу, якая правяла іх у міністры. І вось, каб гэтыя ўпартыя паны не псавалі абедні іншым, іх вырашана было проста прыбраць далей. Для гэтага Ванька-Каін і яго шчырыя зьвярнуліся за дапамогаю да лепшага галаварэза і пераваротчыка падпалкоўніка Волкава, начальніка Омскага гарнізону. Волкаў арыштаваў трох «левых» міністраў, захапіўшы разам і старшыню краёвай думы. Адначасна была разагнана і сібірская (эсэраўская) краёвая дума. Адзін з арыштаваных міністраў, найбольш упарты, па дарозе ў вастрог быў расстрэлены ў загародным гаі афіцэрамі, якія яго вялі, і скінуты ў роў. Рэшта-ж купіла сабе жыцьцё тым, што падпісала заяву аб адстаўцы і дала падпіску аб выезьдзе з Омску. Усё гэта адбылося ў верасьні 1918 году.

У гэты час зьявіўся яшчэ адзін самазванны ўрад ва Уфе. Утварыўся ён так.

Улетку 1918 году, па закліку эсэраў, што находзіліся ў Самары, членаў Устаноўчага сойму, чэха-славацкімі атрадамі быў утвораны там контррэволюцыйны пераварот. Замест нізрынутай савецкай улады ў Самары стаў камітэт членаў Устаноўчага сойму,

іначай «Комуч», абвясьціўшы сябе ўрадам. Складаўся гэты «ўрад» галоўным чынам з эсэраў, але былі там і меншавікі і чорнасоценцы накшталт вядомага пагромніка і вешацеля казацкага атамана Дутава.

Як і сібірскі ўрад, Комуч ставіў сабе галоўнай задачай узброенае змаганьне з бальшавікамі, гэта значыць з рабоча-сялянскімі масамі, апіраючыся на буржуазна-кулацкія пласты насельніцтва. Хутка, з заняцьцем чэха-славакамі Уфы, дзякуючы здрадзе аднаго эсэра, які прабраўся ў штаб Чырвонай арміі, што абараняла Уфу, туды-ж перабраўся з Уфы і эсэраўска-кулацкі Комуч.

«Урад» гэты адчуваў сябе яшчэ горш, чымся омскі. Падтрыманьня з боку насельніцтва ніякага, а тутака яшчэ савецкая Чырвоная армія націскае, зусім да Уралу падыходзіць—і падацца больш няма куды, як у бок Омску...

І вось абодва «ўрады», сябры па няшчасьцю, згаварыліся паміж сабой. На «дзяржаўным пасяджэньні», якое адбылося ў верасьні ў Уфе, з удзелам прадстаўнікоў розных контррэвалюцыйных груп, было вырашана: утварыць з двух адзін аб'яднаны ўрад з местазнаходжаньнем у Омску. Урад гэты павінен быў называцца ўжо ня «сібірскім» (паднімай вышэй!), а «ўсерасійскім».

Омічы на гэта згадзіліся. Чаму-ж бы не! Прыемна падвысіцца ў годнасьць і бачыць сябе кіраўнікамі ня толькі аднэй Сібіры, але і цэлай Расіі. А з другога боку, маючы пад рукою гэткіх памочнікаў, як Анен-

каў і Волкаў з іх малайцамі, омскія кіраўнікі разьлічвалі, у выпадку патрэбы, легка сьпіхнуць сваіх новых компанейцаў, як яны ўжо зрабілі гэта са сваімі «левымі» таварышамі з сібірскага ўраду. Так яно хутка і вышла.

Самазваны «ўсерасійскі ўрад» быў організаваны. Сюды ўвайшлі цалкам усе омскія міністры на чале з Валагодзкім і Міхайлавым. А над гэтым «урадам», у якасьці вышэйшага органу, была пастаўлена так званая «дырэкторыя» з пяці чалавек: чэцьвера ад уфімскага ўраду (эсэры Аўксеньцьеў[1]), Зензінаў, кадэт Вінаградаў і генэрал Болдыраў) і пяты ад омскага (былы эсэр Валагодзкі).

Нядоўга праіснавала гэта «дырэкторыя». Дні яе былі зьлічаны ўжо ў самы момант яе абраньня... У омскіх рэакцыянэраў яшчэ раней насьпеў плян устанаўленьня «цьвёрдай улады». А «цьвёрдую ўладу» яны ўяўлялі сабе ня іначай, як у постаці аднаасобнага дыктатара, які аб'яднаў-бы ў сваіх руках усе контррэволюцыйныя сілы і, сагнуўшы ў бараньні рог ненавісных бальшавікоў, праклаў-бы шлях да аднаўленьня монархіі ў Расіі.

Гутаркі аб такой дыктатуры былі ўжо на уфімскай нарадзе, але там яна не сабрала большасьці, і нарада спынілася на дыктатуры колектыўнай, у асобе «дырэкторыі». Аднак апошняя ня спраўдзіла надзей, якія на яе ўскладаліся.

---

[1]) Кандыдатам да яго абраны эсэр Аргуноў.

Ужо па свайму складу яна аказалася зусім няпрыгоднай для сваёй ролі. Мізэрныя фігуры правых эсэраў, якія верхаводзілі ў дырэкторыі, на справе зьяўляліся толькі цацкамі ў руках чорнасоценцаў і пракладалі сабою шлях для аднаасабовай вайсковай дыктатуры. Омскія «дзяльцы», якія з нецярплівасьцю чакалі гэтакую дыктатуру, вырашылі пачакаць з разгонам дырэкторыі да таго часу, пакуль ня зьявіцца адмысловы кандыдат у дыктатары.

Чакаць прышлося нядоўга. Вельмі хутка гэткі кандыдат зьявіўся.

У сярэдзіне кастрычніка ў Омск прыехаў з Далёкага Ўсходу адмірал Калчак. Яго і выбралі омскія рэакцыянэры.

Хто такі быў гэты Калчак?

Гэта быў заядлы монархісты і ўпарты вораг рабочых і сялян. Яшчэ будучы маладым флёцкім афіцэрам, ён, па яго ўласных словах, марыў аб вайне з Турцыяй і аб захваце ў яе Дарданэлаў для ўслаўленьня расійскай монархіі. З таго часу захопніцкая вайна стала галоўнай думкай усяго яго жыцьця. Пра тое, што такая вайна дасьць выгаду толькі кучцы капіталістых, а для мільёнаў сялян і рабочых—будзе згубаю, ён, як і ўсё афіцэрства клапаціўся меней усяго. Ён думаў толькі аб сваёй ганарлівасьці, аб выслугах і павышэньнях.

І таму дзень, у які пачалася імпэрыялістычная бойка 1914 году, як ён сам прызнаўся, быў «адным з найшчасьлівейшых дзён яго жыцьця». Затое рэволюцыю, нават Лютаўскую, ён спаткаў зусім іначай.

Заядлы монархісты, ён ня мог зьмірыцца нават з буржуазнай рэспублікай і марыў пра аднаўленьне царызму. Да падначаленых яму «ніжніх чыноў»—матросаў і салдатаў—ён ставіўся па-ранейшаму, як да



Адмірал Калчак.

«шэрай скаціны» альбо «гарматнага мяса», а на іх выбарчыя органы глядзеў з адкрытай пагардай. Расказваюць, што, калі першы матросаўскі судовы камітэт, разбройваючы афіцэрскі склад, запрапана-

ваў разброіцца і адміралу Калчаку (ён у гэты час камандаваў Чорнаморскім флётам), чорнасоценны адмірал уважыў за лепшае кінуць свой корцік у мора, каб не аддаваць яго ў «брудныя» рукі матросаў. З гэтага дня ён пераканаўся, что яго адміральская песьня скончана і ў Расіі яму рабіць няма чаго—і ён прадаў сябе чужаземным імпэрыялістым. Спачатку ён запрапанаваў свае паслугі амэрыканцам і з радасьцю ўхапіўся за запрашэньне кіраваць опэрацыямі амэрыканскага флёту супроць туркаў недалёка ад Дарданэлаў. Але гэта не ўдалося. Тады ён запрапанаваў свае паслугі ангельскаму ўраду і быў камандыраваны на турэцкі фронт. У гэты час уся ўлада у нас перайшла да рабочых і сялян, якія не захацелі весьці далей імпэрыялістычную вайну і праліваць кроў за інтарэсы ангельскіх і іншых капіталістых.

Занепакоеныя гэтым, кіруючыя колы Англіі сталі як мага дапамагаць грашыма, зброяй і кіраўніцтвам розным контррэволюцыйным арганізацыям, якія ўсю сваю мажлівасьць накіроўвалі супроць савецкай улады ў Расіі, і пачалі высоўваць патрэбных для гэтай справы людзей.

У ліку іншых была зьвернута ўвага і на адмірала Калчака. Яму было запрапанавана ўзяцца за арганізацыю контррэволюцыйных банд на Далёкім Усходзе для змаганьня з савецкай уладай. Справа гэта спадабалася чорнаму адміралу, і ён едзе за інструкцыямі і грашыма ў Пэкін да былога царскага пасла. князя Кудашова. Той накіроўвае яго ў Харбін да

царскага генэрала Хорвата, які ўтварыў там таксама нейкі «ўрад». Тут Калчак заняўся організацыяй контррэволюцыйных банд на чужаземныя грошы. Але праца пад начальствам Хорвата, як відаць, не здавальняла ганарлівага Калчака. Ён марыць пра больш шырокую дзейнасьць і пра больш высокае становішча.

Організацыяй банд для змаганьня з саветамі на Далекім Усходзе ў гэты час займаліся, акрамя Хорвата і Калчака, яшчэ два чорнасоценных атаманы. Адзін з іх, Сямёнаў, арудаваў у межах Забайкальля, другі, Калмыкаў—у Ўсурыйскім краі. Абодвы «працавалі» на японскія грошы. У Калчака паўстае думка: аб'яднаць усе гэтыя банды і падначаліць іх сабе. З гэтаю мэтаю ён змаўляецца з Сямёнавым і Калмыкавым. Але ні той, ні другі ісьці пад начальства да адмірала Калчака не згаджаюцца. Куды там! Кожнаму з іх хочацца быць бліжэй да смачнага пірага, гэта значыць да японскіх грошай. Тады Калчак зьвяртаецца да японскага ўраду.

— Вы даяце грошы і зброю дальня-ўсходнім атаманам. Дайце іх лепш мне, ня будзеце шкадаваць.

Але японскаму ўраду паслугі Калчаковы не патрэбны. З яго досыць і двух атаманаў, якія шчыра яму служаць, люта зьнішчаючы расійскіх рабочых і сялян. Яны, як верныя сабакі, вартавалі Далёкі Ўсход ад «бальшавіцкай заразы».

Пасьля гэтай няўдачы, Калчак задумаў кінуцца на поўдзень Расіі, дзе ў гэты час «працавалі» контррэволюцыйныя банды царскага генэрала Аляксеева.

што называлі сябе «добраахвотніцкай арміяй». Там ён спадзяваўся знайсьці сабе работу па душы. У «армію» Аляксеева ён спрабуе прабрацца праз Сібір. Але па дарозе спыняецца ў Омску. Дзе хутка зьнюхваецца з мясцовымі чорнасоценцамі. Эсэраўская дырэкторыя ўзрадавалася прыезду беспрацоўнага адмірала і прызначыла яго вайсковым міністрам «усерасійскага ўраду». Калчак прымае гэта прызначэньне, але і сам ён і яго таварышы (па зброі) з омскай вайсковай зграі і членаў омскага ўраду ўжо намецілі для яго, за сьпіной абдуранай дырэкторыі, больш высокае месца.

Ледзь стаўшы вайсковым міністрам, Калчак едзе на «фронт», каб там наладзіць сувязь з монархічным афіцэрствам і згрупаваць яго вакол сябе.

Падрыхтаваўшы глебу для захопу ўлады і забясьпечыўшы сабе падтрыманьне з боку афіцэрства, як на фронце, так і ў Омску, Калчак варочаецца ў Омск. Тут ужо ўсё падрыхтавана для перавароту. І вось уночы на 18 лістапада «надзвычайная» афіцэрская тройка—палкоўнікі Волкаў і Катанаеў і атаман Красільнікаў—арыштоўваюць трох членаў дырэкторыі (эсэраў Аўксеньцева, Аргунова, Зензінава) і загадчыка дэпартамантам міліцыі, эсэра Рагоўскага. У тую-ж ноч наладжваецца экстранае пасяджэньне групы правых міністраў, якая абвяшчае Калчака «найвышэйшым кіраўніком» усяе Расіі і галоўнакамандуючым усімі ўзброенымі сіламі, даўшы яму дыктатарскія, гэта значыць, неабмежаваныя паўнамоцтвы.

Калчак раней усяго шчодра аддзякаваў усіх удзельнікаў перавароту. Усіх міністраў на чале з нязьменным Валагодзкім ён пакінуў на сваіх мясцох, Волкава, павысіў у рангах і годнасьцях—«за асобныя іх паслугі перад бацькаўшчынай». Арыштаваным членам дырэкторыі Калчак літасьціва падараваў жыцьцё, узяўшы ад іх падпіску, што яны ня будуць агітаваць супроць яго, і пад канвоем выслаў за граніцу.

Так было адноўлена самаўладзтва ў Сібіры. Сібірская буржуазія і старое чыноўніцтва з радасьцю віталі ўстанаўленьне «цьвёрдай улады», шырокія-ж масы насельніцтва, асабліва рабочыя і сяляне, глядзелі на пераварот з поўнай неспагадлівасьцю. Для іх што сібірскі ўрад, што дырэкторыя, што Калчак— усе былі аднаго колеру, таму што ні пры адным з гэтых урадаў ня спыняліся лютыя катаваньні і расправы над рабочымі і сялянамі.

## Гульба калчакаўшчыны

Пасьля запанаваньня Калчака, пачалі ўводзіцца старыя царскія парадкі, якія не пасьпеў яшчэ ўвесьці сібірскі ўрад. Самому Калчаку разам з неабмежаванай уладаю была прыўлашчана і царская пашана. У судох адноўлены ўсе старыя царскія законы, у якіх—словы «государ імпэратар» былі заменены словамі: «найвышэйшы кіраўнік». У дадатак да гэтых законаў Калчак уводзіць шэраг новых—аб шырокім дапасаваньні сьмяротнай кары да тых, хто не хацеў

прызнаваць улады самазванага ўладара і яго чыноўнікаў. Паводле гэтых законаў сьмяротныя прысуды выносілі і за «непаслушэнства ўладзе» (а «ўлад» было шмат, пачынаючы з простага гарадавога і стражніка), і за «бязьдзейнасьць улады» (гэты закон патураў усякім крывавым расправам «начальства» над мірным насельніцтвам) і за «ўхіленьне ад вайсковай павіннасьці», і за несваячасовую яўку на вайсковую службу; і за хаваньне зброі (хоць-бы старога іржавага рэвольвэра), і за заклік да забастовак, і шмат яшчэ за што...

Аднак законы ўвадзіліся болей «для выгляду», а на справе Калчак і яго спадручныя ўважалі за лепшае абыходзіцца бяз усякіх законаў, расстрэльваючы і вешаючы сотні і тысячы людзей бяз суду і сьледзтва... У раёне разьмяшчэньня войск арудавалі «вайскова-палявыя суды», якія складаліся з афіцэрскай тройкі. П'яныя афіцэры часьцяком, расстраляўшы бяз суду ні ўчым ня вінных людзей, ужо пасьля расстрэлу выносілі ім сьмяротныя прысуды.

Для падтрыманьня і ўмацаваньня ўлады новага самаўладцы, былі адноўлены скасаваныя яшчэ Лютаўскай рэволюцыяй генэрал-губарнатарствы.

Такім чынам паасобныя мясцовасьці Сібіры былі аддадзены ў поўнае распараджэньне калчакаўскіх генэралаў (Волкава, Розанава і іншых), прызначаных на генэрал-губарнатарскія пасады, разам з неабмежаванымі правамі над жыцьцём і маемасьцю насельніцтва. Пад іх цяжкім ботам стогнам стагнала ўся рабоча-сялянская Сібір...

Была ўсюды адноўлена і старая ахранка, па-новаму—контрвыведка, з былых царскіх жандараў і шпіёнаў. У Омску ня было амаль ніводнае ночы, каб на вуліцах гораду альбо на беразе Іртыша не знаходзілі па некалькі трупаў невядома кім расстраляных людзей бяз усякіх пры іх дакумантаў. Трупы зараз-жа адвозіліся на загародныя могілкі, дзе і хаваліся, як «бяздомныя», бяз ніякай агалоскі. Гэта былі ахвяры калчакаўскай контрвыведкі, арыштаваныя ў гэту ноч. Арыштаваныя звычайна абшукваліся, у іх адбіраліся ўсе грошы, каштоўныя рэчы і дакуманты; апошнія зьнішчаліся, каб унікнуць доказаў, а саміх арыштаваных расстрэльвалі.

Ахова гораду была даручана атраду атамана Красільнікава (удзельніка калчакаўскага перавароту). Гэты атаман і яго падручныя нездарма вядомы ўсёй Сібіры, як заядлыя галаварэзы і рабаўнікі. Красільнікаўцы снавалі па горадзе, як галодныя ваўкі, і, часьцяком сярод белага дня, урываліся ў кватэры перапужаных абываталяў, трэсьлі і перакідвалі ўсё дагары, хапалі людзей і расстрэльвалі...

Атрад рабаўнікоў меўся і пры «асобе» самога Калчака. Гэты атрад ахоўваў стаўку «найвышэйшага кіраўніка» пад начальствам «ваяводы» Кісялёва (былога матроса, які калісьці выратаваў Калчака ад сьмерці і за гэта атрымаў высокую годнасьць начальніка аховы стаўкі). У гэты атрад набіраўся ўсякі зброд з крымінальным мінулым. Гвалты і рабаваньні кісялёўцаў наводзілі жах на насельніцтва. Адбываліся яны, як і ў красільнікаўцаў, з повадуператрускі.

У часеператрусак адбіраліся каштоўныя рэчы і грошы, пасьля чаго абрабаваных адвозілі за горад і расстрэльвалі. Усё гэта рабілася адкрыта. Нават любая сэрцу «найвышэйшага кіраўніка» буржуазія, апора яго «трону», ня ўнікала гвалтаў і зьдзекаў адміральскіх апрычнікаў. Скардзіцца на непарадкі кісялёўцаў, аднак, ніхто не адважваўся. Усясільнага «ваяводы», які карыстаўся асобнай увагай Калчака, усе баяліся. Урэшце ахова стаўкі да таго зганьбіла сябе, да таго абурала супроць сябе насельніцтва, што «кіраўнік», павінен быў згадзіцца на тое, каб аддаць пад суд палову атраду Кісялёва, але над самым «ваяводаю» ён усё-ж такі зьлітаваўся.

Гэткі быў «выканаўчы апарат» калчакаўшчыны, але ня лепшымі былі і яе кіраўнікі. Тут таксама сядзелі рабаўнікі і марадзёры, толькі рабункі тут мелі іншы характар і больш шырокі размах. Кралі і рабавалі народны скарб усе: і міністры і генэралы і сам «кіраўнік».

Калі горад пакідалі белыя Калчаку ўдалося вывезьці з Казані залаты запас, які захаваўся ў Казанскім банку,—некалькі вагонаў золата. З гэтага запасу сотні мільёнаў рублёў золатам былі перададзены за межы, у Англію, Францыю, Амэрыку і Японію,—як плата за падтрыманьне імі Калчака ў яго барацьбе з савецкаю Расіяй.

Калчакаўскі ўрад, які голасна заяўляў, што ён змагаецца з бальшавікамі, абараняючы расійскія інтарэсы, інтарэсы расійскага народу, сапраўды працаваў на карысьць замежных капіталістых і імпэрыя-

лістых. Акрамя таго, што ён перадаў за граніцу сотні мільёнаў расійскага золата і ўтрымоўваў за народныя сродкі замежнае войска ў Сібіры (чэхаў, палякаў, сэрбаў, ангельцаў, французаў), ён аддаў у поўнае распараджэньне чужаземцаў усе чыгункі ў Сібіры, дазволіў карыстацца шмат якімі прадпрыемствамі, на шкоду расійскім рабочым і сялянам.

Арудуючы такім парадкам, Калчак і яго ўрад мелі адну мэту: пры дапамозе зброі чужаземцаў як мага ўтрымаць уладу і, калі-б удалося, нізрынуць савецкую ўладу, зьвярнуць зямлю памешчыкам, фабрыкі і заводы—капіталістым, а трон—Раманавым. Чужаземныя-ж імпэрыялістыя за сваю дапамогу ў гэтым атрымалі-б магчымасьць усялякімі спосабамі рабаваць народнае багацьце краіны.

Усё гэта было на-руку чужаземным банкірам і імпэрыялістым, і нездарма чужаземныя ўрады, асабліва ангельскі, гэтак старанна падтрымлівалі Калчака і яго ўрад. З дапамогаю ангельцаў Калчак і прышоў да ўледы. Глеба для гэтага, як ужо сказана вышэй, была падрыхтавана злачыннай контррэвалюцыйнай палітыкай меншавіцка-эсэраўскіх урадаў (дырэкторыі і Часовага Сібірскага ўраду). На гэтыя ўрады павінна цалкам легчы ўся адказнасьць за жахі расправы над насельніцтвам Сібірскага краю, за разгром рэвалюцыйных арганізацый, якія адны толькі і маглі-б арганізаваць масы супроць рэакцыйнай дыктатуры. Контррэволюцыйнае змаганьне меншавікоў і эсэраў супроць савецкай улады нямінуча прыводзіла да «калчакаўшчыны».

Пры стаўцы Калчака знаходзіліся сталыя прадстаўніцтвы (місіі) Англіі, Францыі, Чэха-Славакіі, Японіі і іншых буржуазных дзяржаў. На чале ангельскай місіі быў генэрал Нокс, які фактычна кіраваў політыкай Калчака. Гэта місія забясьпечвала омскага кіраўніка ўсім вайсковым узброеньнем і абмундзіраваньнем, агнястрэльнымі прыпасамі, зброяю, броневікамі і іншым. Акрамя таго яна давала сваіх інструктароў для навучаньня калчакаўскіх афіцэраў і унтэраў. Начальнік францускай місіі пры Калчаку генэрал Жанен, зьяўляўся галоўнакамандуючым усімі чужаземнымі атрадамі ў Сібіры і таксама энэргічна падтрымліваў, па наказу свайго ўраду, омскага самазванца ў яго змаганьні з рабочымі і сялянамі. У тымжа напрамку працавалі іншыя чужаземныя прадстаўнікі.

Такім чынам буржуазныя ўрады заходніх дзяржаў фактычна прызнавалі омскага верхавода забойцаў і рабаўнікоў за кіраўніка «дзяржавы расійскай». Прызналі яго ўладу над сабою, як «найвышэйшага кіраўніка» і чорнасоценныя генэралы, якія ваявалі з савецкай Расіяй на іншых франтох: Дзянікін, Юдзеніч, Мільлер. Аб прызнаньні Калчака расійскай буржуазіяй і гаварыць няма чаго: яна спала і бачыла адмірала Калчака, як ён уяжджае на белым кані ў Маскву, вольную ад бальшавікоў... Не прызнавалі Калчака толькі рабоча-сялянскія масы, як не прызнавалі яны раней самазваных—сібірскага ўраду і дырэкторыі.

# Сяляне і рабочыя паўстаюць супроць Калчака

Сялянскія паўстаньні, якія ўвесь час ня спыняліся, з прыходам Калчака пачынаюць узмацняцца. З нячуванай жорсткасьцю прыдушаныя ў адным месцы, яны загараліся яркім полымем у другіх мясцох. Да моманту запанаваньня Калчака, амаль, уся Сібір ужо гарэла агнямі паўстаньняў, і ніякія зьверствы сібірскай атаманаўшчыны не маглі задушыць іх. Працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам бальшавіцкіх організацый, як адзін чалавек, паўстала супроць самазванага кіраўніка і яго спадручных.

У лістападзе-сьнежні 1918 г. паўсталі сяляне Мінусінскага павету, абураныя незаконнымі рэквізыцыямі і рабункамі. Узброіўшыся чым папала, сялянскія атрады аблажылі горад Мінусінск, дзе знаходзіліся калчакаўскія заправілы. Па афіцыйных даных, усяго супроць гораду выступіла дзевяць тысяч сялян. Каля дзьвюх тысяч з іх былі ўзброены вінтоўкамі, паляўнічымі стрэльбамі і рэвольвэрамі розных сыстэм, ад старадаўніх, нікуды няварттых да сучасных наганаў, браўнінгаў і кольтаў. Галоўная-ж маса паўстанцаў рушылася ў паход, узброеная сякерамі, нажамі, віламі і самаробнымі пікамі са звычайных палак, спэцыяльна для гэтага зробленых з насаджанымі на іх жалезнымі наканечнікамі. Мінусінскае паўстаньне на гэты раз было пераможана вайсковымі часткамі, якія прышлі на дапамогу мясцоваму гарні-

зону з Краснаярску, але насельніцтва, як і ў іншых мясцох Сібіры, не ўціхамірылася і хутка дало ведаць аб сабе новымі паўстаньнямі.

Усьлед за Мінусінскім узьнімаецца адно за адным і растуць паўстаньні ў Петрапаўлаўскім, Барнаўльскім, Каменьскім, Канскім паветах, у Тайшэцкім чыгуначным раёне і іншых мясцовасьцях Сібіры.

Калчак і яго ўрад дзіка прыдушвалі паўстаньне. Пасылаецца шэраг карных экспэдыцый. Асабліва ў гэтых экспэдыцыях адзначаліся ўлюбёнцы Калчака, якія дапамаглі яму стаць самаўладцам: Волкаў, Красільнікаў і Катанаеў.

Генэрал Волкаў, які лютаваў у Петрапалаўскім і сумежным паветах, выдаў загад: усіх «бальшавікоў» расстрэльваць на месцы, дамы іхныя паліць, а маемасьць забіраць у «казну». Гэты загад выконваўся спадручнымі Волкава як ня трэба лепей. З зруйнаваных імі вёсак асабліва пацярпела Марынка, дзе было шмат ахвяр як сярод паўстанцаў, так і сярод мірных жыхароў—старыкоў, жанчын і дзяцей. Волкаўцы ўрваліся ў Марынку, хапалі вінаватых і невінаватых і растрэльвалі іх, кідалі бомбы ў сялянскія хаты, палілі дамы і двары, сем'і расстрэленых выкідалі на вуліцу і забіралі ў іх усё да ніткі. У вёсцы было спалена больш паўсотні дамоў, перабіта каля дзьвюх тысяч жыхароў. Гэта ў адным толькі параўнаўча невялікім сяле. Тое самае рабілася і ў іншых сёлах. У самым горадзе Петрапаўлаўску волкаўцамі былі захвачаны былы камісар працы і каля

пяцідзесяці чалавек культурна-асьветных працаўнікоў. Усіх катавалі ў будынку народнага дому.



Сібірскі партызан. (Скульптура).

У нагароду за ўсе свае зьверствы Волкаў атрымаў павышэньне: ён быў прызначаны генэрал-губарната-

рам у Іркуцку. Тут ён ня кідаў сваёй справы і выдаў загад: «бальшавікоў і сялян, якія бальшавіцтвуюць, для прыгрозы, расстрэльваць не па аднаму, а дзесяткамі».

Атаман Красільнікаў пасланы ў Канскі і Тайшэцкі раёны (Янісейскай губ.), адзначаўся асобнаю лютасьцю. Ён любіў уласнаю рукою расстрэльваць бальшавікоў, прычым да расстрэлу доўга любіў мучыць свае ахвяры, усяляк зьдзекваючыся над імі. Гэты кат ня меў зьлітаваньня ні да старога, ні да малога. Яго «малайцы», набіўшы сабе рукі на забойствах і рабунках у Омску, руйнавалі і нішчылі цэлыя вёскі. Ня гледзячы, аднак, на ўсе зьверствы Красільнікава, яму не ўдалося зусім прыдушыць паўстаньня ў раёне.

Сяляне-паўстанцы, якіх падмацоўвалі і кіравалі імі ўцёкшыя з гарадоў рабочыя і з вайсковых часьцей салдаты,—хаваліся ў лясох і адтуль зьнянацку нападалі на карныя атрады, робячы ім вялікую шкоду. Часамі паўстанцы выходзілі з тайгі на лінію чыгункі, разьбіралі яе, абстрэльвалі цягнікі з вайсковымі часьцямі і грузамі і спускалі іх пад адхон.

Каб застрашыць паўстанцаў і прымусіць іх быць паслухмянымі, гаспадарыўшы ў Янісейскай губэрні калчакаўскі генэрал-губарнатар Розанаў прыдумаў зьвярыны спосаб расправы са сваімі палоньнікамі. Ён напоўніў вастрогі прадстаўнікамі разагнаных рэволюцыйных і профэсіянальных організацый і абвясьціў усіх іх закладнікамі. Па усіх гарадох і сёлах быў разасланы загад Розанава: расстрэльваць па дзесяць закладнікаў за кожнага, што пацярпеў у часе

нападу, белагвардзейца, а за кожны напад на цягнікі — расстрэльваць закладнікаў пачкамі, бяз ліку. Загад гэты шырока праводзіўся на справе. Загінула шмат рэволюцыянэраў, але сялянства руху гэта ня спыніла...

Нездаваленьне калчакаўшчынай пачыняе ахапляць і салдацкія масы, сярод каторых узьнікаюць нелегальныя (патаемныя) бальшавіцкія ячэйкі. І салдаты калчакаўскага войска ўсё часьцей пачынаюць пераходзіць адкрыта на бок рабочых і сялян. У самым гнязьдзе чорнага адмірала, горадзе Омску, хутка-ж пасьля запанаваньня Калчака, мясцовая комуністычная організацыя, з дапамогаю салдат омскага гарнізону, здолела організаваць сьмелы напад на мясцовы краёвы астрог для вызваленьня зьняволеных у ёй таварышоў, якім з дня на дзень пагражала сьмяротная кара ад рук калчакаўскіх катаў.

Уночы на 22 сьнежня, па пастанове партыйнай організацыі, узьнялі паўстаньне салдаты некалькіх рот омскага гарнізону. Паўстанцы захапілі некаторыя ўстановы. Група іхняя, чалавек у трыста, на чале з некалькімі партыйцамі, абкружыла вастрог, перарэзаўшы тэлеграфныя і тэлефонныя правады. Абязброіўшы варту, паўстанцы ўвайшлі ў астрог, зьвязалі вартавога афіцэра, адабралі ў яго ключы ад камер, і адчынілі ўсе памяшканьні. Усё гэта было зроблена хутка, без адзінага стрэлу. Усе, хто сядзеў у вастрозе, былі вызвалены. Шмат каму з іх, на чале з камісарам Міхельсонам, удалося ўцячы. Іншыя былі злоўлены калчакаўцамі і загінулі. Некаторыя, у тым

ліку група былых членаў устаноўчага сходу, спадзяючыся на «милость», на другі дзень дабраахвотна вярнуліся ў турму. Але гэта ня выратавала іх ад сьмерці. Усе яны былі ўночы выведзены на бераг Іртыша і тут забіты. Іх секлі шашкамі, калолі штыхамі, расстрэльвалі з рэвальвэраў і вінтовак. Пасьля расправы трупы іх пакідалі ў сьнежныя суметы Іртыша, дзе ледзь былі адшуканы праз некалькі дзен раднёю і таварышамі. Паўстаньне, слаба арганізаванае, зараз-жа было прыдушана. Лютыя расправы цягнуліся тры дні. За гэтыя дні было расстрэлена, павешана, засечана шаблямі і ўтоплена каля паўтары тысячы чалавек. Замерзлыя ў розных позах трупы забітых, падабраныя на вуліцах, завозіліся за горад на фурманках, накіданыя дзесяткамі адзін на аднаго... Большасьць загінуўшых—салдаты і рабочыя...

Але рух сярод рабочых і салдат ня спыняецца. У тым-жа сьнежні ў горадзе Кузьнецку былі арыштаваны і расстрэляны бяз суду і сьледзтва больш за шэсьцьдзесят чалавек салдат і рабочых за вынесеную імі рэзолюцыю рэволюцыйнага характару. Калчакаўскі ўрад ужываў усякія шляхі і спосабы, каб вылавіць рэволюцыянэраў. Адноўленыя ў ранейшых правах былыя царскія жандары і шпіёны працавалі з уздымам. За кожнага злоўленага рэволюцыянэра была вызначана нават грашовая ўзнагарода—па тысячы і больш рублёў «за галаву». Да вышуку было прыцягнута і духавенства. Адзін з папоў (гарнізонны сьвяшчэньнік гораду Барнаўлу), з мэтаю выведаць настрой салдат, 17 студзеня 1919 г. наладзіў у

палкавой царкве гутарку аб змаганьні з бальшавікамі. Пасьля прамовы папа слухачом было дазволена задаваць яму пытаньні. Некаторыя з іх, не чакаючы нічога дрэннага, адкрыта выказалі свае думкі. Праз тры дні больш за дваццаць салдат і два афіцэры былі арыштаваны. Восемнаццаць з іх былі расстрэлены.

У пачатку лютага ў Омску ўзгарэлася паўстаньне рабочых, арганізаванае краёвым камітэтам партыі бальшавікоў. Паўстанцы захапілі чыгуначную станцыю Куломзіна, што недалёка ад Омску, адкуль павялі наступ на калчакаўскую сталіцу. Але патрэбных сіл у паўстанцаў і на гэты раз аказалася мала. Паўстаньне было задушана і панесла шмат ахвяр. Захваченыя ўдзельнікі паўстаньня былі пазабіваны і замучаны ў калчакаўскіх катавальнях.

11 сакавіка ў Томску былі арыштаваны шаснаццаць камуністых, з іх дзевяць памерлі ў часе катаваньня, рэшта расстрэлена.

Амаль у адзін час, 13 сакавіка, у горадзе Цюмені ўзьнялося паўстаньне мобілізаваных салдат. Салдаты адмаўляліся ісьці на фронт, супроць савецкай арміі, куды зганялі пры дапамозе нагаек, штэмпэляў і прыкладаў. Калі паўстаньне было прыдушана, расстралялі каля двух сот чалавек.

Калчакаўская армія пачынае паддавацца што раз то болей на супроцьсавецкім фронце, у Прыўральлі.

У першы час пасьля прыходу Калчака вайсковае шчасьце ўсьміхнулася чорнаму адміралу: пры дапа-

мозе чэха-славакаў яму ўдалося нанесьці моцны ўдар Чырвонай арміі, якая ішла з Масквы вызваляць сібірскіх сялян і рабочых, удалося заняць шэраг гарадоў, дайшоўшы да Казані. Гэты часовы посьпех Калчака тлумачыцца тым, што, па-першае, Чырвоная армія ў той час яшчэ толькі фармавалася, а па-другое, тым, што галоўныя сілы яе былі кінуты на барацьбу з арміяй Дзянікіна на Паўднёвым фронце і Юдзеніча—на Паўночным... Але ўлетку 1919 г. армія Дзянікіна была разьбіта, а ўсьлед зьнішчана і армія Юдзеніча. Чырвоная армія разьвязала сабе рукі для змаганьня з арміяй Калчака на Ўральскім фронце.

З гэтага часу вайсковае шчасьце здрадзіла Калчаку. Чырвоная армія, атрымаўшы значную падмогу, пачала перамагаць. Калчаку прышлося адыходзіць. У канцы чэрвеня 1919 г. чырвонаармейскімі часьцямі быў заняты горад Перм, а ў сярэдзіне ліпеня, перайшоўшы Уральскі хрыбет па сьлядох ворага, Чырвоная армія заняла горад Екацярынбург. Шлях паміж гэтымі двума гарадамі, працягам у трыста пяцьдзесят вёрст, той самы шлях, які да гэтага адваёўваўся белай арміяй Калчака ў савецкай арміі крок за крокам цэлыя паўгода, цяпер быў пройдзены Чырвонай арміяй усяго толькі за два тыдні.

Адступленьне калчакоўскіх часьцей стала пошасьцю. Белагвардзейцы ў перапалоху ўцякалі пры адным толькі набліжэньні Чырвонай арміі, кідаючы зброю, вайсковую маемасьць і запасы. Усё гэта пераходзіла ў рукі Чырвонай арміі. Гвалтоўна мобілізаваныя Калчаком салдаты масамі дабраахвотна здава-

лiся ў палон альбо пераходзiлi цэлымi часьцямi на бок Чырвонай армii.

Паўстанцкiя рабоча-сялянскiя атрады, якiя хавалiся да часу ад калчакаўскiх шпiёнаў у няпрыступных лясох i гарах, выходзiлi са сваiх прытулкаў, насiлi вялiкiя ўдары тылу адыходзячага ворага, а калi прыходзiла Чырвоная армiя—далучалiся да яе.



Целы рабочых, расстрэленых калчакоўцамi ў лютым 1919 г. у пасёлку Куломзiна (Пад Омскам).

Насельнiцтва, вызваленае ад Калчака i яго генэралаў i атаманаў, з радасьцю сустракала прыход чырвонага войска. Па словах аднаго вiднага дзеяча уральскай буржуазii, якi ўцёк разам з iншымi на ўсход пры наблiжэньнi Чырвонай армii, сiбiрскiя сяляне вельмi неспачуваючы сустракалi бежанцаў з-за Уралу i на расказы ўцякаўшых ад савецкай улады кулакоў i спэ-

кулянтаў аб тым, што бальшавікі нібыта прыгнечваюць сялян, звычайна адказвалі:

— Што вы расказваеце байкі? У нас ужо былі бальшавікі, і нічога дрэннага ад іх мы ня бачылі. Вы проста маніце.

Апавядальнікам пра савецкія жахі даводзілася бегчы далей.

А на фронце справы з кожным днём ішлі ўсё горш для Калчака і яго падручных. Сьледам за Екацярынбургам заняты былі Цюмень, Табольск і шэраг іншых гарадоў. Чырвоная армія шпарка пракладала сабе шлях да самога сэрца калчакоўскага панства, гораду Омску. Фронт усё бліжэй падыходзіў да сібірскай сталіцы. Зьбянтэжаны «найвышэйшы кіраўнік» і галоўнакамандуючы ў перапалоху кідаўся між сваёй сталіцай і фронтам, куды ён, па прыкладу сьвятой памяці цара Мікалая другога, час ад часу наяжджаў, каб «узьняць заняпалы дух» свайго войска. З гэтых паездак у Сібіры кпілі. Часта даводзілася чуць такія гутаркі:

— Дзе наш «найвышэйшы»!

— Паехаў у Петрапалаўск (альбо які-небудзь іншы горад) здаваць чырвонаармейцам.

І сапраўды было гэта. Кожная паездка сьмелага адмірала на фронт адзначалася тым, што ўсьлед за яго ад'ездам горад, які ён наведваў, альбо сяло пераходзілі ў рукі савецкага войска.

Баючыся сутычак з Чырвонай арміяй і «абальшавічаньня» сваіх салдат, чужаземныя ўрады, адзін за адным, пачалі сьпехам адпраўляць свае часьці на

радзіму. Да лета 1919 г. у сібірскай контррэволюцыі засталіся толькі японскія часьці, разьмешчаныя на Далёкім Усходзе, ды зусім ненадзейныя, нязначныя атрады былых вайсковых палонных у Сібіры: польскія, сэрбскія і румынскія.

Дні калчакаўскага панаваньня былі ўжо зьлічаны...

## Жахі Сямірэчча

Увосень, перад сваім канцом, мухі бываюць асабліва кусьлівымі. Апанавала лютая злосьць і калчакаўскіх атаманаў і генэралаў, калі ім стала ясна, што іх песьня сьпета і што іхнаму крываваму панству надыходзіць канец. І сваю лютую злосьць яны з асобай жорсткасьцю накіравалі на бязбройнае і мірнае сялянскае насельніцтва. Асаблівую старанасьць выказаў вядомы ўжо нам атаман Аненкаў са сваімі вернымі катамі.

«Пачатак канца» калчакаўшчыны застаў Аненкава ў Сяміпалацінскай губэрні. Асеўшы тутака, ён адчуваў сябе незалежным царком гэтага краю. Пад крылом у Аненкава, як у чужаземнай дзяржаве, часта знаходзілі сабе гасьцінны прытулак і бясьпечнасьць афіцэрскі і спэкулянцкі зброд, які ўцёк з Омску, дзе яму пагражалі няпрыемнасьці за якія-небудзь злачынствы. Часамі Калчак адважваўся пасылаць у вотчыну свайго падначаленага сьледчых для сьледзтва злоўжываньняў атамана Аненкава і яго памочнікаў. Але, як толькі зьявіцца гэткі сьледчы ў панства Аненкава, усясільны атаман і яго прыбліжаныя паказ-

валі яму на дзьверы, і ён, сьпяшаючыся, паварочваў назад (гэтак абыходзіліся з чыноўнікамі Калчака і Далёка-Ўсходнія атаманы—Сямёнаў і Калмыкаў).

Але хутка Аненкаву давялося сыйсьці з гэтага наседжанага месца. Сыйсьці не таму, што баяўся Калчака: з ім ён заўсёды мог пасяброўску наладзіць (крумкач крумкачу вачэй ня выдзяўбе), а таму, што баяўся сялянскіх паўстаньняў, якія расьлі навокал і Чырвонай арміі, якая набліжалася. Да рэчы сказаць, з часьцямі савецкай арміі Аненкаў са сваім войскам ні разу ня стыкаўся, бяручы за лепшае заставацца ў глыбокім тылу. Сваю «сьмеласьць» ён выказваў выключна ў распраўах над мірным насельніцтвам, якое можна было забіваць і грабіць бяскарна. Але варта было толькі нават дрэнна ўзброеным сялянам пайсьці супроць, як «неперваможны» атаман трусьліва адступаў. Цяпер ён і на сабе і на іншых калчакаўскіх атаманах (хоць-бы Красільнікаву) пераканаўся, што ня гледзячы ні на якія распраўы, рэвалюцыйнага руху ня спыніць, і стаў падумваць аб тым, як выратаваць уласную галаву. Ён ведаў, што калі ён застанецца ў Сяміпалацінску, будзе дрэнна, што ня сёньня-заўтра ён можа папасьці ў перапалку паміж чырвонаармейскімі часьцямі і паўстанцкімі атрадамі і што адсюль яму будуць адрэзаны ўсе шляхі да адступленьня. І ён вырашыў загадзя павесьці свае атрады ў Сямірэчча, бліжэй да кітайскай мяжы, за якую, калі трэба будзе, ён мог-бы схавацца ад заслужонай расплаты за ўсе свае зладзействы.

Адступленьне ў Сямірэчча адзначылася такімі

зьверствамі, перад якімі бляднеюць усе ранейшыя злачынствы Аненкава і яго малайцоў.

Перад адступленьнем Аненкаў рэквізаваў амаль усіх сялянскіх коняй і мобілізаваў дарослых сялян у якасьці фурманоў. За нязначную правіннасьць падводчыкаў білі і расстрэльвалі. Закульгае ў дарозе конь, альбо зломіцца кола, альбо парвецца збруя,— фурману крышка: застрэляць і кульгавага каня і разам з ім гаспадара і трупы іх кінуць на дарозе. Рабілі гэта для таго, каб падводчыкі наўмысьля не псавалі коняй і калёс.

У час адступленьня па Сергіопольскаму тракту, на працягу пяцідзесяці вёрст, аненкаўцамі былі абрабаваны і спалены ўсе кіргіскія (казакскія) аулы. Аненкаўцы, як дзікія зьвяры, кідаліся на аулы, зьбіралі ўсю скаціну, запасы і маемасьць, гвалцілі кіргіскіх жанчын, і адыходзячы, палілі аулы дашчэнту. Паліць загадаваў сам атаман Аненкаў, як ён гаварыў, па стратэгічных (г. зн. вайсковых) меркаваньнях.

У адным ауле бандыты забралі семсот галоў скаціны і ўсю маемасьць, згвалцілі ўсіх жанчын і расстралялі старыка-кіргіза за тое, што ён заступіўся за гэтых жанчын. У другім ауле расстралялі пяцярох кіргізаў, у ліку іх адну дзяўчыну, якая протэставала супроць гвалту. Другую жанчыну гвалцілі ўсе разам, пасьля чаго яна памерла. Згвалцілі і яе сьвякруху, Парунбаеву—і іншых. Дзьве старыя жанчыны з гэтага аулу пайшлі шукаць абароны і справядлівасьці ў самога атамана. Аненкаў выслухаў іх, потым загадаў арыштаваць і некалькі сутак трымаў пад вартай.

Яшчэ суровей адносіўся ён да тых, хто прыходзіў скардзіцца з другога аулу. З гэтага аулу, як звычайна абрабаванага і спаленага аненкаўцамі, кіргізы паслалі да атамана трох найбольш паважаных у сяле старыкоў—васьмідзесяцігадовага Орумбаева і іншых—з просьбаю заступіцца. Аненкаў і іх выслухаў, потым даў свайму ад'ютанту распараджэньне: пакараць усіх трох бізунамі. Распараджэньне было выканана тут-жа, у прысутнасьці самога атамана, які, седзячы на крэсьле, назіраў за katаваньнем. Білі старыкоў з такой шчырасьцю, што адзін з іх праз тры дні пасьля катаваньня памёр.

У адным ауле, каля пікету Ашыгуль, дзе быў лягер аненкаўцаў, жыў кіргіз Мухаметдзіеў, жонка якога была самай прыгожай жанчынай на ўсім тракце. Даведаўшыся пра гэта аненкаўскія афіцэры і захацелі пазабавіцца красуняй. Мухаметдзіеў жывым ні за што не аддаў-бы жонку,—аненкаўцы ведалі гэта. Трэба было спачатку пазбавіцца ад яго. І вось да Мухаметдзіева зьяўляюцца двое аненкаўскіх салдат: атаман быццам выклікае нечага ў Ашыгуль. Не чакаючы здрады, кіргіз запрог пару коняй і разам з пасланцамі паехаў у Ашыгуль. За аулам аненкаўцы накінуліся на Мухаметдзіева, зьбілі яго і скінулі з калёс, а коняй пагналі. Праз некаторы час у аул зьявіліся пяць узброеных аненкаўцаў, забралі жонку забітага і павезьлі яе ў Ашыгуль. Там трымалі яе ў палоне пятнаццаць дзён, па чарзе гвалтуючы яе ўсёй ротай. Праз пятнаццаць дзён няшчасная, ня вытрымаўшы, памерла. Гэтак гаспадарыў Аненкаў у кіргіскіх аулах.

Адышоўшы з Сяміпалацінску ў Сямірэчча, Аненкаў уладзіўся спачатку ў Лепсінскім раёне. Першыя дні прайшлі бяз сутычак аненкаўцаў з сялянамі. Мясцовае насельніцтва, хоць і чула пра крывавыя ўчынкі атамана ў Сяміпалацінску (чуткамі зямля поўніцца), але не пасьпела яшчэ зазнаць гэтыя ўчынкі на сваіх уласных сьцінах і таму не супярэчыла з аненкаўцамі. Аднак хутка аненкаўцы пусьцілі ў ход усе свае звычайныя спосабы. П'яная, свавольная банда аненкаўскіх афіцэраў і казакаў стала рабіць налёты на бліжэйшыя сёлы, катаваць і расстрэльваць сялян, рабаваць маемасьць, гвалціць жанчын і інш. Абураныя гэтымі расправамі сяляне Лепсінскага павету ўсе як адзін паўсталі супроць гвалтаўнікоў. Гэта адбылося ў лютым 1919 г. Паўстаньне дасягнула вялікіх памераў, ахапіўшы цэлы шэраг сёлаў і вёсак: Чаркаскае, Нова-Троіцкае, Нова-Антонаўскае, Пакацілава, Вясёлава, Нова-Андрэеўскае, Усьпенскае, Глінскае, Асіпаўскае, Надзежынскае, Канстанцінаўку і частку Уджарскага раёну. Узброіўшыся насьпех чым папала—паляўнічымі стрэльбамі і салдацкімі вінтоўкамі (у каго яны былі), самаробнымі пікамі, віламі і косамі,—паўстанцы акапаліся і сталі чакаць ворага. Утварыўся фронт вёрст на сто. Як казаў сам Аненкаў, Лепсінскі фронт уяўляў сабою пазыцыі, затуленыя па ўсіх правілах вайсковай тэхнікі. Асабліва стойкі і героічны адпор аненкаўцам быў зроблены на франтавым участку, каля сяла Андрэеўскага. Першыя напады аненкаўцаў былі з посьпехам адбіты паўстанцамі. Сяляне двойчы прымушалі іх уцякаць,

узялі ў іх некалькі кулямётаў, знарады і адну гармату. Ня звыклы да такой упартай стойкасьці паўстанцкіх атрадаў, Аненкаў пусьціўся на хітрыкі, і, як воўк у байцы Крылова, надумаў увайсьці ў перагаворы з сялянамі. Ён паслаў ім ліст, у якім пісаў: «Я не хачу вашай крыві і прышоў ня крыўдзіць вас, а аднавіць мір і парадак. Пакіньце ваяваць з намі. Займецеся лепш мірнай працай. Хутка надыйдзе вясна. Вам трэба рыхтавацца да работ у полі, а вы траціце час на фронце» і гэтак далей. У канцы ліста Аненкаў пагражаў лютай расправай, калі сяляне не здадуцца.

Добра пеў атаман Аненкаў, але абдурыць сялян яму не ўдалося. Яны добра ведалі, што здацца аненкаўцам—усёроўна, што пайсьці жывымі ў пастку кракадзіла. І яны яму адказалі: «Калі ты сапраўды ня хочаш праліваць крыві, то ідзі адгэтуль са сваім войскам. А парадак мы і самі ў сябе навесьці зможам».

Атрымаўшы гэткі адказ, Аненкаў з страшэннаю лютасьцю стаў распраўляцца з насельніцтвам навакольных вёсак.

Вось што апавядае селянін пасёлку Леанідаўка:

— «Я ў гэты час быў у адным з атрадаў паўстанцаў. Мы ішлі па пятах аненкаўцаў, адкідваючы іх да сяла Чаркаскага. Памятаецца, станіца Уджар. Уся яна была заліта крывёю. Усюды валяліся чалавечыя трупы. Асабліва ўрэзаўся ў памяць адзін малюнак. Як цяпер бачу—ляжыць мёртвая голая жанчына. Грудзі і правая рука ў яе адсечаны. Левае вока вынята нейкай завостранай палкай. Палка з вокам

уткнута ў зямлю. Побач кол, на калу—грудное дзіця. У руцэ ў яго былі грудзі, адсечаныя ў жанчыны.

Недалёка ад трупа дзіцяці ляжала дзяўчынка гадоў дванаццаць-трынаццаць. Яна была яшчэ жывая. Адно вока ў яе было вынята, на аднэй шчацэ зрэзана істужкай скура і на правай руцэ адсечаны два пальцы... У вачох цёмна рабілася і кружылася галава, калі мы глядзелі на гэтыя штукі аненкаўскіх катаў. Забітыя якраз былі сям'ёй аднаго нашага паўстанца. Ён, як убачыў іх, дык зараз-жа і памёр ад разрыву сэрца...»

У сяле Карабулак аненкаўцы расстралялі і пасеклі шаблямі ўсіх да аднаго мужчын, западозрыўшы насельніцтва гэтай вёскі ў шпіёнстве.

Ня гледзячы, аднак, на ўсю лютасьць, ня гледзячы на ўгаворы, абяцанкі і пагрозы з боку Аненкава, лепсінцы стойка трымалі свой фронт. Гэтак яны пратрымаліся цэлых чатырнаццаць месяцаў, героічна адбіваючы заядлыя атакі аненкаўскіх часьцей, якія перавышалі паўстанцаў па сваёй сіле і тэхніцы. І толькі тады, калі на падмогу Аненкаву прышлі голад, тыфус і цынга, якія бралі ў паўстанцаў шмат ахвяр,—яны змушаны былі скласьці зброю пад дзікім напорам ворага. Ды і дзіўна было-б далей трымацца змучаным, стомленым сялянскім байцам, калі супроць аднэй толькі вёскі Андрэеўскі Аненкаў рынуў у бой пятнаццаць тысяч сваіх казакаў і салдат. Андрэеўка была занята 19 сакавіка 1919 году.

Усьлед за Андрэеўкай пачалі здавацца Аненкаву і іншыя ўмацаваныя селішчы. Болей за ўсіх—у пра-

цягу яшчэ трох месяцаў—пратрымалася сяло Чаркаскае, вельмі добра ўмацаванае акопамі на семнаццаць вёрст. Але ўрэшце, і яно прымушана было здацца. Галоўныя сілы абаронцаў Чаркаскага і іншых сёлаў пасьпелі адыйсьці ў горы і лясы. Тутака яны стварылі моцны і нязлоўны для аненкаўцаў партызанскі атрад «горных арлоў», якога Аненкаву так і не ўдалося разьбіць да самага канца грамадзянскай вайны ў Сямірэччы. Аненкаву і яго падручным давозілася спаганяць сваю дзікую злосьць на тых, хто застаўся ў вёсках. Азьвярэлыя бандыты рабілі над імі нячуваныя гвалты і зьдзекі.

У адных толькі сёлах Чаркаскім і Пакацілаўцы засечана і расстрэлена 1800 чалавек. У ліку іншых быў захвачаны камандны і палітычны склад чаркаскага гарнізону.

Тав. Тузава, упаўнаважанага палітаддзелу, дапытываў сам Аненкаў.

— Прызнавайся, Тузаў, што савецкая ўлада ідзе няправільным шляхам, абяцаю табе за гэта падараваць жыцьцё.

Тав. Тузаў у адказ на гэта запатрабаваньне плюнуў Аненкаву ў вочы і сказаў:

— Брэшаш ты нягоднік!

Тав. Тузаў быў зараз-жа пакараны сьмерцю. Адначасна з ім пакараны былі і шмат іншых чаркаскіх змагальнікаў.

Аненкаўскія часьці ў некаторых мясцох зьнішчалі ўсе цалкам сёлы, палячы іх дашчэнту. У лісьце да свайго памочніка, палкоўніка Сідарава, Аненкаў гэ-

тага не хавае і піша: «Тры сялы прызнавалі савецкую ўладу, ну і прышлося іх зьнішчыць усё чыста, чаліць усе дамы і гэтак далей». Але ня тры сялы былі зьнішчаны і спалены па загаду атамана. Шмат вёсак зусім апусьцелі: у іх можна было сустрэць усяго па тры-чатыры чалавекі, прычым толькі жанчын.

У Уч-Аральскай воласьці было гэтак шмат забітых, што іх ніхто не хаваў, ды і ня было каму клапаціцца пра гэтае. Разьвялося шмат сабак, якія карміліся трупамі забітых і да таго адзічэлі, што пачалі кідацца на жывых людзей.

Расправа з безабароннымі цяпер вёскамі ішла некалькі месяцаў, аж да глыбокай восені.

20 чэрвеня аненкаўцы ўрваліся ў вёску Канстанцінаўку. Сяляне-старыкі, якія засталіся ў вёсцы, спадзяючыся ўлітасьцівіць бандытаў пайшлі насустрач з абразамі. Бандыты далі па іх залп і некаторых забілі тут-жа на месцы. Пасьля гэтага яны ўзяліся секчы і расстрэльваць без разбору ўсіх, хто пападаўся ім пад рукі. Вёска была спалена, у агні загінула шмат дзяцей і жанчын. Тых хто выбягаў з падпаленых дамоў, аненкаўцы тут-жа забівалі альбо адпраўлялі ў вялікі будынак школы, які потым падпалілі. Усе, хто быў у будынку, загінулі. Жывёла і маемасьць сялян, як звычайна, былі разабраны. У шмат якіх дамох пазабіваны ўсе дарослыя мужчыны. Жанчын гвалцілі, некаторых да сьмерці. З акопаў прыпаўзьлі ў вёску раненыя—восем чалавек. Аненкаўцы жывымі закапалі іх у зямлю.

На пасёлак Нова-Шульбінскі тры разы нападалі аненкаўскія банды. Бандыты білі семдзесят пяць жыхароў пасёлку, у тым ліку некалькі жанчын. Шмат каго расстралялі і засеклі шаблямі. Палілі дамы, рабавалі маемасьць, гвалцілі жанчын і дзяўчат.

Ня маючы магчымасьці злавіць, што схаваліся ў гарах, партызанаў, аненкаўцы з асаблівай лютасьцю катавалі іх сем'і.

У кастрычніку бандыты наляцелі на сяло Перавальнае. Сагналі на сход усіх жыхароў сяла, адвялі ў бок сем'і «горных арлоў» і тут-жа ўсіх іх пасеклі... Ад гэтай расправы загінула больш за сто чалавек— старыкі, жанчыны і дзеці. Потым бандыты пайшлі па хатах, пазабіралі маемасьць, падпалілі вёску і паехалі..

Гэтакі жудасны малюнак меў месца і ў сяле Падгорным. У сяло прыехаў атрад аненкаўцаў пад камандай афіцэра Арбузава. Сабралі сто чатырнаццаць чалавек—сем'і «горных арлоў»—і ўзяліся секчы іх.

Каб заглушыць стогны забіваемых, частка атраду голасна сьпявала песьні. Пазабіваўшы ўсіх, бандыты паехалі. Але праз тры дні атрад вярнуўся ў вёску, пазабіваў тых, хто застаўся жывы, у тым ліку жанчын і дзяцей, а вёску спаліў дашчэнту. Пра пагалоўнае зьнішчэньне сяла Падгорнага за прызнаваньне савецкай улады сам Аненкаў пісаў з гонарам свайму памочніку, палкоўніку Сідараву.

Жахі апрычніны Івана Грознага нішто перад расправай аненкаўцаў з сялянкай Галенкавай, муж і сын якой пайшлі да чырвоных. Атрад аненкаўцаў пад

камандай Вінаградава, прыляцеўшы ў сяло, дзе жыла Галенкава, узяўся зьнішчаць сем'і чырвоных. Гален-



„Пальчатка" з чалавечай скуры, садраная калчакоўцамі з рукі жывога палоннага чырвонаармейца — на ст. Сахарная в 1919 г. (Захоўваецца ў музэі Чырвонай арміі ў Маскве).

каву прывязалі да конскага хваста і так правалаклі па дарозе некалькі верст. У няшчаснай была садрана

на сьпіне ўся скура, разьбіта галава. Двухгадоваму сыну Галенкавай адсеклі руку і ён памёр, а другога сынка—чатырохгадовага—бандыты скалечылі, зрабіўшы яго гарбатым на ўсё жыцьцё.

Перад адыходам сваім у Кітай аненкаўцы зноў прыехалі ў гэта сяло, каб зьнішчыць усіх хто спачуваў чырвоным. Некаторых сялян кідалі на зуб'я бараны, а зьверху на іх клалі другую барану. Шмат каго расстралялі і засеклі. Вёску спалілі.

Але гэта былі ўжо апошнія скокі бясьсільнай ярасьці крывавага атамана і яго памочнікаў. Хутка Аненкаву стала вядома, што сібірская армія Калчака разьбіта і што пераможныя часьці савецкай Чырвонай арміі перайшлі Урал і ня сёньня-заўтра будуць у Сямірэччы. Чырвонай арміі Аненкаў баяўся, як агню, і таму загадзя даў загад, пакуль ня позна, адходзіць за кітайскую мяжу. Гэта было ў пачатку 1920 г.

У часе адступленьні да кітайскай мяжы аненкаўцы расстрэльвалі і секлі «ўсіх маладушных і трусьлівых» са сваіх-жа салдат і афіцэраў. На працягу 200 вёрст ад сяла Глінкоўскага, па берагох возера Ала-Куля, аж да Джунгарскіх варот, дарога была усьцяж усеяна трупамі салдат.

— Жудасны малюнак,—расказвалі тыя, хто бачыў,—у возеры трупы, у рэчках трупы, дыхаць цяжка...

Гэта былі трупы салдат з брыгады падначаленага Аненкаву генэрала Ярушына, якія, здаволіўшыся крывавымі распраўамі атамана з насельніцтвам, адмо-

віліся, урэшце, выступаць супроць сялян. Аненкаў пры дапамозе свайго кітайскага палка абяззброіў непакорную брыгаду. Бяззбройныя салдаты былі заведзены ў непраходныя алакульскія чараты і тут пасечаны кітайцамі, а трупы, іхныя часткаю кінуты па дарозе—сабакам і груганом. Так загінула каля паўтары тысячы аненкаўскіх салдат.

У часе адступленьня ў Кітай асобная Сямірэчанская армія Аненкава налічвала да восемнаццаці тысяч чалавек. Яна была разьбіта на тры групы. Паўночная група, пад камандай генэрала Бакіча, накіравалася да кітайскай мяжы праз Алтай і Ойрацію, руйнуючы па дарозе селішчы і вытрымліваючы заядлыя сутычкі з алтайскімі партызанамі. Паўднёвая група гвалтам уварвалася ў Туркастан і адтуль накіравалася на Кашгар (у кітайскім Туркастане). Сярэднюю групаю камандаваў атаман Аненкаў. Яна праходзіла па спустошанаму Лепсінскаму раёну Сямірэчча, да паўзьмежнага кітайскага гораду Кульджэ.

Аненкаў бачыў, што яго разбойніцкая кар'ера ўжо скончана і што яму ня прыдзецца болей рабаваць і руйнаваць гарады і сёлы. Таму лішнім клопатам было цяпер мець шматлікі атрад, бо на ўтрыманьне атраду трэба было-б траціць нарабаваныя ў Сібіры грошы. І вось у Аненкава зьяўляецца плян, як пазбавіцца ад добрай паловы сваіх салдат. Мы ўжо бачылі, што шмат іх, па загаду атамана, было пабіта на берагох возера Ала-Куль. Цяпер ён надумаў зрабіць новую чыстку атраду. Каля самай мяжы ён сабраў свой атрад і выступіў перад ім з прамовай аб тым, што ён

ня прымушае нікога ісьці за граніцу: хто з іх ня хоча ісьці з ім, можа заставацца ў Савецкай Расіі.

Потым атаман скамандаваў:

— Хто хоча застацца, выходзь на дзесяць крокаў наперад!

Выйшла каля дзьвюх тысяч салдат і некалькі афіцэраў. З Аненкавым засталося тысячы чатыры.

Ва ўсіх, хто захацеў застацца, была адабрана зброя і абмундзіраваньне. Іх адзелі ў рызьзё і загадалі зараз-жа ісьці. Шлях у Расію ляжаў праз горную цясьніну. У самым вузкім месцы гэтай цясьніны, ў гарах, абапал дарогі, па распараджэньню Аненкава, былі схаваны кулямёты. І вось, ледзь толькі даўгая калёна адпушчаных у Расію падышла да гэтага месца цясьніны, як па ёй адкрылі страшэнны кулямётны агонь. Лягло на месцы больш за паўтары тысячы чалавек. Мала каму ўдалося выратавацца.

Пасьля гэтага Аненкаву захацелася трохі пацешыць тых, хто засталіся вернымі яму, афіцэраў і добраахвотнікаў. Ён даў загад затрымаць сем'і афіцэраў, якія захацелі вярнуцца ў Расію, і наогул тых, якія выклікалі да сябе падазрэньне. Жонкі і дочкі гэтых афіцэраў былі аддадзены атаманам на пацеху сваіх «удальцоў». Бандыты гвалцілі іх цэлымі эскадронамі, не шкадуючы і дзяўчынак. Пасьля згвалчаньня няшчасных засякалі шаблямі. У аднаго афіцэра, палкоўніка Лугоўскага, на яго вачох былі згвалчаны і потым засечаны яго жонка і тры дачкі, узростам у дванаццаць, семнаццаць і дзевятнаццаць га-

доў. Ад перажытага жаху Лугоўскі звар'яцеў і тут-жа быў забіты.

Неякім цудам удалося ўцячы ад гэтае дзікасьці жонцы аднаго афіцэра з дванаццацігадовай дзяўчынкай, згвалчанай і з адсечанай рукой.

Гэта быў апошні ўчынак атамана Аненкава на савецкай тэрыторыі.

У маі 1920 г. Аненкаў з астачаю сваёй арміі ўвайшоў у межы Кітаю.

## Партызаншчына

Калчакаўская ўлада дажывала свае апошнія дні. Разгром Калчака ішоў адначасна і на фронце і ў тыле. Савецкая Чырвоная армія, якая наступала на фронце, з кожным днём усё далей адганяла рэшту калчакаўскай арміі на усход ад Уралу, углыбь Сібіры. А ў тылу калчакаўскім атрадам наносілі ўдары партызанскія дружыны сялян і рабочых, пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных ячэек.

Партызанскі рух у Сібіры быў раней стыхійнага, неарганізаванага характару. Тлумачылася гэта тым, што партыйныя бальшавіцкія арганізацыі з прычыны здрадніцтва эсэраў і меншавікоў былі зьнішчаны і кіраваць партызанскім рухам ня было каму. Таму вось першыя сялянскія паўстаньні, накшталт славутага слаўгародзкага паўстаньня, ня маючы моцнай арганізаванасьці, хутка прыдушваліся, выносячы шмат ахвяр.

Але троху-па-троху партыйныя організацыі на мясцох аднаўляліся і мацнелі. Навокал нешматлікіх рэволюцыйных партыйных працаўнікоў, што захаваліся ад эсэраўскіх і калчакаўскіх распраў, групаваліся новыя партыйныя сілы рабочых, сялян і салдатфрантавікоў. На сваіх уласных сьпінах зазнаўшы ўсе прынады эсэраўска-меншавіцкага «народоправства», яны вельмі хутка пераканаліся, што толькі комуністычная партыя цьвёрда абараняе інтарэсы працоўных мас, і ішлі ў партыйныя падпольныя організацыі. У партызанскіх атрадах узьнікаюць комуністычныя ячэйкі, якія фактычна бяруць у свае рукі кіраўніцтва рухам. Яны зьвязваюцца з мясцовымі нелегальнымі партыйнымі організацыямі, праз іх трымаюць сувязь з перадавымі атрадамі Чырвонай арміі, вядуць агітацыйна-прапагандыцкую працу, атрымоўваючы дырэктывы ад цэнтральных партыйных органаў. Такое кіраўніцтва партыйных організацый надае партызанскаму руху, як і ўсяму рэволюцыйнаму руху ў Сібіры, устойлівы, плянавы і організаваны характар. Ён расьце і становіцца ўжо сур'ёзнаю пагрозаю калчакаўшчыне.

Партызанскі рух у Сібіры, з кожным днём разрастаючыся ўсё больш, дасягнуў найвышэйшага свайго разьвіцьця ў сярэдзіне лістапада 1919 году, да таго моманту, калі Чырвоная армія заняла сталіцу Калчаковіі—горад Омск.

Да гэтага часу ў розных мясцох Сібіры мелася ўжо некалькі шматлікіх, добра організаваных і моцна злучаных партызанскіх груп. Групы гэтыя знаходзіліся



Атаман Аненкаў у Кітаі.

адна ад аднае на вялікіх адлегласьцях, і не заўсёды маглі дзейнічаць між сабою ўзгоднена.

Але ўсё-ж яны змагаліся з посьпехам і яшчэ да прыходу савецкай Чырвонай арміі, што была ад іх на адлегласьці двух-трох тысяч вёрст, наносілі вялікія страты калчакаўцам і інтэрвэнтам (чужаземным часьцям), адваёўваючы ў іх чыгуначныя станцыі, гарады і цэлыя раёны.



Самаробная „гармата“ і пікі алтайскіх партызан. (Захоўваюцца ў музэі Чырвонай арміі, у Маскве).

Адна з такіх моцных партызанскіх груп дзейнічала на паўднёвым захадзе Сібіры, у Алтайскай і сумежных з ёю паветах Томскай губэрні.

Гэты вялікі раён зьяўляецца хлебнай жытніцай Сібіры і маслабойным цэнтрам. Тут было некалькі цэнтраў партызанскага руху. Самы буйны з іх знаходзіўся ў Слаўгародзкім павеце. Гэты павет, яшчэ ў верасьні 1918 г. зруйнаваны бандамі атамана Аненкава, з таго часу ў працягу цэлага году, не пакарыў-

шыся ўладзе гвалтаўнікоў, гуртаваў і зьбіраў сілы, неабходныя для канчатковага зрынуцьця гэтай улады. Спачатку арганізацыю тутака партызанскіх атрадаў узялі на сябе працаўнікі першага слаўгародзкага паўстаньня, што уцалелі ад аненкаўскай расправы. Асабліва—чорнадольскі селянін, т. Церабіла, былы член рэволюцыйнага штабу. Выпадкова ўратаваўшыся ад расстрэлу, ён прыняўся організоўваць сялян. Штомінуту рызыкуючы трапіць у рукі калчакаўцаў, ён разьяжджаў на сваёй шаўлюжцы, запрэжанай у старыя калёсы, з аднэй вёскі ў другую, Там ён стварыў нелегальныя сялянскія камітэты і залучаў байцоў у партызанскі атрад, які хаваўся ў няприступным Ваўчыхінскім бары. Атрад гэты быў непераможным да самага канца грамадзянскай вайны. Ён рос надзвычайна шпарка і, зьліўшыся з іншымі партызанскімі атрадамі, утварыў цэлую невялікую сялянскую армію пад камандаю былога франтавіка т. Мамантава.

Цэнтрам партызанскага руху ў Слаўгародзкім павеце на гэты раз зрабілася сяло Салонаўка, дзе знаходзіўся штаб Мамантава. Да гэтага раёну, акрамя ўсяго Слаўгародзкага павету, імкнуліся Барнаульскі Каменьскі і паўночная частка Бійскага паветаў. Увесь гэты вялікі абшар межаваўся з мнотаводнай ракой—Обь і яе Зарэчнай паласой, дзе партызаны знаходзілі сабе пэўны прытулак. З захаду сюды блізка падходзіў Сяміпалацінскі раён, які таксама кішэў партызанскімі атрадамі, паднарадкаванымі агульнаму камандаваньню Момантава. Апорным пунктам

партызан тут была чыгуначная станцыя Рубцоўка, якая знаходзілася ў краі вялікага лясістага бору. За ўладаньне гэтай станцыяй ішлі ўпартыя бойкі паміж партызанамі і калчакаўскімі атрадамі. За восень 1919 г. Рубцоўка некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі, пакуль партызаны нарэшце зусім не заўладалі ёю, выцісьнуўшы адтуль калчакаўцаў. Часамі ў рукі партызан пераходзіў увесь вучастак чыгункі ад Барнаулу да Сяміпалацінску, на працягу каля паўтараста вёрст, і партызаны ўтрымоўвалі яго за сабою па дватры тыдні.

Да лістапада 1919 г. пад камандаю Мамантава было ўжо да дваццаці пяці партызанскіх палкоў. Гэта была цэлая армія, добра ўзброеная, якая мела кулямёты і нават артылерыю (гарматы). У яе складзе, акрамя пяхоты, былі і конныя часьці. Калчакаўцы, якія перавышалі яе сваімі сіламі, некалькі разоў разьбівалі гэту армію, але кожны раз яна зноў адраджалася і змагалася з яшчэ большаю ўпартасьцю. 20 лістапада партызанамі быў заняты горад Слаўгорад, адкуль на гэты раз белагвардзейцам ужо не ўдалося больш выбіць іх. Сьледам за Слаўгорадам, пасьля некалькіх дзён, мамантаўцы занялі Сяміпалацінск, нядаўнюю сталіцу атамана Аненкава, а ў пачатку сьнежня—горад Барнаул. Ва ўсіх гэтых гарадох яны трымаліся да прыходу савецкай арміі.

Акрамя мамантаўскай арміі, якая мела да трыццаці тысяч байцоў, у той-жа Алтайскай губэрні дзейнічалі яшчэ чатыры партызанскія арміі. У аднэй з іх, пад камандай Міласлаўскага, налічвалася да чатырох



Адзін з кіраўнікоў партызанаў т. Бураў.

тысяч чалавек, у другой, пад камандай Плятнёва,—каля трох тысяч і ў дзьвюх астатніх—Чаўзава і Рогава—каля тысячы чалавек у кожнай. Гэтыя арміі дзейнічалі ў паўднёвай частцы губэрні (у Бійскім павеце), абапал ракі Бії, з выхадам да чыгункі. Рух пачаўся ў стэпавай частцы, але потым перайшоў у горны раён Алтаю, дзе цэнтрам руху зрабілася сяло Чорны Ануй.

У адзнаку ад мамантаўскай арміі, усе паўднёвыя атрады Алтайскай губэрні былі дрэнна ўзброены. Нават простых стрэльб у партызанаў было мала. Большасьць іх была ўзброена толькі самаробнымі пікамі-«тычкамі». З гэтым вось першабытным узброеньнем сяляне часта хадзілі шчытнаю масаю на прыступ супроць кулямётаў супрацiўніка. Пад бязупынным дажджом куль яны высьцілалі сваімі трупамі ўсё поле бітвы, але тыя, хто ўцалеў, зьбівалі праціўніка з яго пазыцыі і бязьлітасна зьнішчалі яго сваімі пікамі. Горны Алтай быў няпрыступным прытулішчам для партызанаў і вельмі цяжка было тут іх прасьледваць калчакаўскім карным атрадам.

Ужо пад канец лета 1919 г. гэты раён быў вызвалены ад калчакаўцаў, а ў пачатку восені былі скліканы зьезды дэлегатаў вызваленых валасьцей: спачатку ў сяле Салонашэнскім, а потым у сяле Чорны Ануй. Было ўхвалена весьці барацьбу да канца, з якой мэтай мобілізаваць усіх мужчын узростам ад 19 да 40 год. Усе паўстанцкія атрады, па пастанове зьезду, павінны былі лічыцца часьцямі адзінай народнай

арміі і падпарадкавацца галоўнаму штабу, які быў абраны ў сяле Чорны Ануй.

Бійскі павет Алтайскай губэрні, дзе адбываліся гэтыя зьезды, межаваўся на поўдні з Томскай губэрняй, дзе таксама арудавалі партызанскія атрады пад камандаю Лубкова, Голінава, Матузава, Талкунова, Перавалава. У адзнаку ад алтайскіх партызанаў, гэтыя атрады былі дрэнна арганізаваны. Калчакаўцы ціснулі і часта амаль зусім зьнішчалі іх, але кожны раз яны адраджаліся зноў.

Для калчакаўскага ўраду, аднак, больш грознай сілай былі партызанскія атрады паўднёва-ўсходняй часткі Янісейскай губэрні: Ачынскага, Канскага і Мінусінскага паветаў і ў сумежнай паласе чыгункі. Гэты раён быў заняты сялянскімі арміямі Шчацінкіна і Краўчэнкі, у складзе якіх, як і ў арміі Мамантава, былі пяхота, коньніца і артылерыя. У арміі Шчацінкіна было да пятнаццаці тысяч байцоў, у Краўчэнкі—каля дзесяці тысяч. Абедзьве арміі былі добра ўзброены вінтоўкамі і кулямётамі. Былі нават і гарматы. Абодвы камандзіры гэтых армій—Шчацінкін і Краўчэнка—былі афіцэрамі ў старой арміі.

Абодва яны пачалі фармаваць паўстанцкія атрады яшчэ з восені 1918 г. Увесну наступнага году яны аб'ядналіся.

Цэнтрам партызанскага руху гэтых армій было спачатку вялікае прытаежнае сяло Стэпавы Баджэй. Тут знаходзіўся галоўны штаб паўстанцаў, быў абсталяваны свой патронны завод, меўся добра абсталяваны вайсковы шпіталь. Тут-жа ішла культурна-ась-

ветная праца, мелася школа і выдавалася газэта «Сялянская Праўда». Затуленае з тылу ад калчакаўскіх нападаў горамі і непраходнай тайгой, а з фронту (лінія чыгункі) агароджанае некалькімі радамі драцяных загарадаў, сяло Стэпавы Баджэй паўгода (з зімы 1918-19 г. па чэрвень 1919 г.) зьяўлялася цэнтрам маленькай Баджэйскай Савецкай рэспублікі, якая аб'яднала Баджэйскую і суседнюю ёй Пятроўскую воласьць і не прызнавала ўлады Калчака. Для ўсьмірэньня гэтай рэспублікі калчакаўскі ўрад згрупаваў на бліжэйшай чыгуначнай станцыі Камарчага вялікія вайсковыя сілы (з расійскіх і чэха-славацкіх часьцей) і ўлетку 1919 г. кінуў іх на ўсьмірэньне паўстанцаў. Стэпа-Баджэйскія партызаны героічна адстойвалі кожную пядзю сваёй зямлі. Але сілы былі няроўныя. Панёсшы вялікія страты партызаны павінны былі адступіць углыб тайгі, пакінуўшы наседжаныя месцы. Уся воласьць была спалена «пераможцамі». Але армія Шчацінкіна і Краўчэнкі ня была пераможана. Вытрымаўшы надзвычайна цяжкі паход праз нетры тайгі, яна вышла адтуль на поўдзень, да Абаканскага стэпу, і накіравалася да гораду Мінусінску. Праходзячы праз спадарожныя селішчы, армія зноў узрастала, папаўняючы свае шэрагі сьвежымі сіламі. Па дарозе яна заняла вялікае сяло Каратуз, адкуль ганебна ўцяклі мясцовыя верхаводы. Каля сяла Ермакоўскага партызаны былі нагнаны пасланым ім на сустрач з Мінусінску з вялікімі сіламі ротмістрам Болагавым. Зьнячэўку напаўшы на партызанаў, Болагаў разьбіў іх. Каб адцягнуць час і сабрацца з



Адзін з кіраўнікоў партызанаў, т. Шчацінкін.

сіламі, партызаны адступілі ў суседні Уранхайскі край (цяпер Тану-Тувінская рэспубліка), дзе занялі горад Белацарск, выгнаўшы адтуль калчакаўскіх чыноўнікаў. Тут партызаны хутка аправіліся. Для іх зьнішчэньня да Белацарску ізноў быў пасланы той-жа ротмістр Болагаў з вялікімі сіламі. Але на гэты раз партызаны спаткалі яго іначай. Заманіўшы атрады Болагава да самага Белацарску, на круты бераг ракі Янісея, яны абкружылі іх і скінулі з высокіх скал у раку. Камандзір атраду Болагаў быў ранены і ледзь вyратаваўся. Партызанам дасталася вялікая вайсковая здабыча: некалькі сот вінтовак, больш з дзесятку кулямётаў, некалькі гармат ды іншае.

З гэтага часу партызанская армія ўзмацнела і ішла ад перамогі да перамогі. З Уранхайскага краю яна зноў рушылася на Мінусінск. Насельніцтва спадарожных вёсак і сёлаў, праз якія яна праходзіла, радасна сустракала партызанаў. Калчакаўская ўлада ўсюды выганялася. Сур'ёзных боек з калчакаўцамі нідзе ня было. Мінусінская буржуазія і мясцовая ўлада, напружаная няўдачамі атраду ротмістра Болагава, пры набліжэньні партызанаў да Мінусінску сьпешна ўцяклі з гораду. У верасьні 1919 г. партызаны занялі Мінусінск і ўвесь прылеглы да яго хлебародны, густа населены раён. На гэты раз паўстанцы ўмацаваліся тут вельмі цьвёрда, пратрымаўшыся каля чатырох месяцаў, аж да прыходу Чырвонай арміі. Тут угрунтаваўся галоўны штаб т. Шчацінкіна, які кіраваў ваеннымі дзеяньнямі партызанаў у паласе чыгункі. Партызанская армія, пад камандай



Адзін з кіраўнікоў партызанаў тав. Якавенка.

Шчацінкіна, складалася цяпер з адзінаццаці палкоў. Мінусінскія сяляне з ахвотаю папаўнялі яе шэрагі і дастаўлялі для арміі хлеб, мяса і фураж. Імя Шчацінкіна было ў сялян у вялікай павазе і давераньні. Гэта ўлічваў і калчакаўскі ўрад і спачатку імкнуўся схіліць т. Шчацінкіна на свой бок, абяцаючы яму вялікую грашовую ўзнагароду і генэральскі чын. Але Шчацінкін адхіліў гэту прапанову, і тады намесьнік Калчака ў Янісейскім краі, генэрал Розанаў, абвясьціў, што дасьць вялікую ўзнагароду ўсякаму, хто заб'е т. Шчацінкіна хоць-бы з-за вугла. Аднак найманых забойцаў сярод насельніцтва не знайшлося. Партызанская армія, пад камандаваньнем Шчацінкіна, была для калчакаўцаў моцнаю пагрозаю да самага канца іх панаваньня.

Акрамя Мінусінскай арміі Шчацінкіна, шмат клопату калчакаўскім генэралам і адміністратарам рабілі партызаны Тасееўскага раёну. Цэнтрам руху тут было вялікае хлебнае сяло Тасеева, Канскага павету, якое ляжыць у таежнай мясцовасьці, у ста дваццаці пяці вярстох ад чыгункі. У тайзе, якая абкружае гэта сяло, знаходзіцца цэлы шэраг капальняў золата, дзе да вайны здабывалася дзесяткі тон золата. Заўладаўшы хлебным сялом, партызаны імкнуліся захапіць золатапрамысловы раён, каб пазбавіць калчакаўскі ўрад прыбыткаў ад золатапрамысловасьці. Калчакаўцы, у сваю чаргу, як мага стараліся, каб ня выпусьціць з рук гэта «залатое дно». Барацьба за аўладаньне ім вялася за пераменным посьпехам усю зіму 1918-19 г. Але паўстанцы нарэшце ўсё-ж пера-

маглі і выціснулі белых з гэтага раёну. Непраходная Янісейская тайга была добрай абаронай партызанаў. З боку-ж чыгункі сяляне рабілі для абароны ад нападу сьнежныя акопы і ледзяныя валы. З гэтымі загародамі і пад абаронай тайгі тасееўскія сяляне заставаліся незалежнымі ад калчакаўскай улады, не плацілі ёй падаткаў, не давалі салдат, коняй і хлеба. Тасееўцы, таксама як і мінусінцы, пратрымаліся аж да прыходу Чырвонай арміі. Кіраўнікамі партызанаў у гэтым раёне былі браты Бабкіны і т. Якавенка. Тав. Якавенка быў адзін час наркомам земляробства.

У Іркуцкім раёне з посьпехам змагаліся з белымі партызанскія атрады т. Караландашвілі і т. Тузава.

Гэтак сібірскія партызаны, дапамагаючы савецкай арміі ў тылу і аблягчаючы ёй пераможнае прасоўваньне наперад, забівалі апошнія цьвікі ў труну адмірала Калчака і яго верных аднамысьнікаў.

## Канец калчаковіі

Чырвоная армія падходзіла да сталіцы Калчаковіі—Омску. Калчак і яго ўрад каналі. Для прыдушэньня партызанскіх рухаў у тылу, з фронту бяруцца надзейныя і верныя чорнаму адміралу часьці і перакідаюцца ў тыл. Але гэта ня выратоўвае становішча: агнём паўстаньня ахоплена ўжо ўся Сібір, і тушыць яго позна. Чужаземцам ужо не да таго, каб падтрымліваць Калчака. Чужаземныя прадстаўнікі, адзін за адным, сьпешна ўцякаюць з Сібіры на ўсход, пакідаючы пад абаронай сваіх штыхоў толькі чыгун-

ку, патрэбную для адпраўкі на радзіму чужаземных вайсковых часьцей. У першую чаргу уцякаюць з Сібіры чэха-славакі, якія ня так даўно яшчэ дапамагалі калчакоўцам засьміраць расійскіх сялян і рабочых.

Омскі ўрад яшчэ дзесятага лістапада ўцёк з Омску ў Іркуцк, пад абарону японскіх штыхоў. На пераезд ураду, з усімі яго штатамі і сем'ямі патрэбна была вялікая колькасьць вагонаў. Вагонаў не хапала да таго-ж шмат іх патрабавалася для чужаземных войск, якія гаспадарылі на чыгунцы. І вось адбываецца новая подласьць і бесчалавечнасьць. Рыхтуючыся ўцячы на ўсход, омскі ўрад яшчэ загадзя даў сакрэтны загад: ачысьціць усе вагоны, занятыя палітычнымі зьняволенымі і палоннымі.

Загад быў дакладна выкананы. Усе зьняволеныя і палонныя былі расстрэлены на глухіх чыгуначных станцыях. Для гэтага іх некалькі месяцаў трымалі ў няпаленых быдлячых вагонах, тыднямі не даючы ім ні есьці, ні піць. Людзі гнілі ў брудзе і вошах, грызлі скураныя рамяні, пілі ўласную мачу. Сьмерць для шмат каго была збаўленьнем ад пражываных пакут. Галоднаю сьмерцю загінула больш тысячы чалавек, зьняволеных у трумах барж, адпраўленых з Табольску перад заняцьцем гораду чырвонымі. Пакутнікам не давалі ніякай яды...

Усьлед за сваім урадам як мага ўцякаюць на ўсход пад абарону японцаў, і харобрыя калчакаўскія генэралы, якія ледзь ня б'юцца адзін з адным за права займаць месцы ў вагонах. Але хутчэй за ўсіх ішлі на ўсход чэха-славакі, якія цяпер ўжо ня цырамоніліся

з калчакаўскімі генэраламі і па-просту вытрушвалі іх з вагонаў. Гэтак быў выкінуты нейкім чэскім камэндантам нават галоўнакамандуючы калчакаўскай арміяй, генэрал Каппель. Рабілі гэта чэхі на правох часовых гаспадароў, бо ўся чыгуначная лінія паміж Омскам і Іркуцкам, абкружаная з усіх бакоў партызанамі, былі ў іхных руках.

14 лістапада савецкая Чырвоная армія заняла Омск, сталіцу белай Сібіры. З гэтага дня калчакаўскае панства фактычна скончылася. Сам Калчак, адстаўшы ад свайго ўраду, каб у выпадку ўдачы быць бліжэй да сваёй «арміі» (а да рэчы і да вагонаў з залатым запасам, якія ён не хацеў пакідаць, спадзяючыся вывезьці іх з сабою на Далёкі Ўсход), хаваўся да пары ў сваім цягніку, недзе паміж Омскам і Іркуцкам, пад абаронай чужаземцаў, якія ахоўвалі дарогу.

Між тым Чырвоная армія шпарка пасоўвалася наперад. 11 сьнежня яна заняла Сяміпалацінск, нядаўнюю сталіцу атамана Аненкава, а 14 была ўжо ў Нованікалаеўску (важны стратэгічны пункт, які ляжыць на стыку дзьвюх чыгунак і вялікай суднаходнай ракі—Обі). Мізэрныя рэшткі разьбітай калчакаўскай арміі нястрымным патокам каціліся ў напрамку да Іркуцку, з надзеяю прабіцца на Далёкі Ўсход, да атаманаў Сямёнава і Калмыкава. Прабіцца, аднак, было ня так лёгка. Ухіляючыся сутычак з Чырвонай арміяй, калчакаўцы апынуліся ў агнёвым коле паўстанцаў. 12 сьнежня паўстанцамі з бою быў узяты Краснаярск, галоўны горад Янісейскай гу-

бэрні, нядаўняя сталіца калчакаўскага намесьніка генэрала Розанава (які цяпер арудаваў ужо ва Ўладзівастоку), на рацэ Янісею, па лініі чыгункі (паміж Celeb Нованікалаеўскам і Іркуцкам). Праз некалькі дзён хваля паўстаньня перакачваецца да Іркуцку, апошняга прытулішча калчакаўскага ўраду.

21 сьнежня паўстаюць рабочыя Чарэмхаўскіх каменавугальных капальняў, каля Іркуцку. А 24 сьнежня пачынаецца паўстаньне і ў самым Іркуцку. Тут быў дадзены апошні і рашучы бой калчакаўскай уладзе. Бой ішоў дзень і ноч на вуліцах гораду і яго прадмесьці. З боку паўстанцаў у ім прымалі ўдзел акрамя рабочых дружын, некаторыя рэгулярныя вайсковыя часьці, што перайшлі на бок рэволюцыі. Бой ішоў, з невялікімі перапынкамі, амаль адзінаццаць дзён. І хоць з першых-жа дзён выявілася, што перамога за паўстанцамі, калчакаўцы ўпарта не хацелі здавацца, чакаючы дапамогі з боку чыцінскага «царка», атамана Сямёнава. Калчакаўскія міністры перабраліся на гэты час у цягнік францускага генэрала Жанена і там адсежваліся. Дапамога ад чыцінскага атамана прышла толькі на дзесяты дзень паўстаньня. Сямёнаў прыслаў на выручку сваіх аднадумцаў тры бранявыя цягнікі і адборны атрад галаварэзаў пад камандай генэрала Скіпетрава. Дружным напорам паўстанцаў атрад быў увесь чыста разьбіты і пабег да свайго атамана, разам з рэшткамі войск генэрала Сычова. Туды-ж уцяклі і калчакаўскія міністры, акрамя тых, якія былі ўзяты ў палон паўстанцамі і пасаджаны ў Іркуцкую турму, пакуль будзе суд над імі.



Наступленьне Чырвонай арміі ў Сібір.

Уночы на 4 студзеня 1920 г. Іркуцк быў канчаткова ачышчаны ад калчакаўскіх банд. Калчакаўская ўлада была канчаткова нізрынута.

Разьбітыя калчакаўскія генэралы і міністры, уцякаючы з Іркуцку на Далёкі Ўсход, пасьпелі зрабіць яшчэ адно нячувана-ганебнае злачынства. Разам з нарабаванаю маемасьцю яны павезьлі з сабою трыццаць аднаго закладніка (у ліку іх адну жанчыну), якіх калчакаўская контр-выведка захапіла перад гэтым у Іркуцку на адным з падпольных сходаў. У ліку гэтых закладнікаў былі настаўнікі, коопэратары і іншыя грамадзкія працаўнікі. 5 студзеня ўсе яны, моцна зьвязаныя вяроўкамі, пад канвоем афіцэраў і трыццаці пяці салдат былі дастаўлены на станцыю Байкал, адлегласьцю ў шэсьцьдзесят вёрст ад Іркуцку, на беразе Байкальскага возера. На досьвітках 6 студзеня ўсе яны былі пераведзены на параход ледакол «Ангара» і кінуты ў трум. Тут няшчасных білі нагайкамі, білі палкамі і жалезнымі ламамі. Пасьля гэтага іх пакаралі сьмерцю. Ледакол адвялі далёка ад берагу. Быў суровы саракаградусны мароз. Возера было ахутана густым туманам і пакрыта крыгамі плывучага лёду. Каты распраналі сваіх палоньнікаў да гала, па аднаму выводзілі іх на палубу і ставілі на самы край. Тут адзін з катаў ударам цяжкай драўлянай даўбешкай па галаве глушыў няшчаснага і скідаў яго ў ледзяныя хвалі Байкалу. Гэтак загінулі ўсе да аднаго. Пасьля гэтага ледакол вярнуўся ў прыстань.

Дзе-ж у гэты час быў сам «найвышэйшы кіраўнік»?

Ён усё яшчэ знаходзіўся ў сваім цягніку, у хвасьце чэха-славацкіх эшалёнаў, адрэзаны і ад свайго былога ўраду, і ад сваёй разьбітай арміі, ня маючы магчымасьці прарвацца ні наперад, ні назад. Пераканаўшыся ўрэшце, што яго справа канчаткова праіграна і што надышоў момант падумаць аб тым, як выратаваць уласную скуру, ён урачыста зрокся ад сваёй улады, якой на справе ў яго цяпер ужо ня было. Ён прызначае сваімі наступнікамі: па Расіі — вядомага пагромшчыка генэрала Дзянікіна (няведаючы, напэўна, што банды гэтага генэрала на поўдні ўжо пераможаны савецкай арміяй), а па Далёкаму Ўсходу і Сібіры ня менш славутага бандыта, атамана Сямёнава. Пасьля такога, нікому не патрэбнага, зраканьня Колчак, з дазволу каманадаваньня чужаземнымі сіламі ў Сібіры, перайшоў са свайго цягніка ў міжнародны вагон, які ішоў пад сьцягамі пяці саюзных дзяржаў, спадзяючыся пад абаронай гэтых сьцягаў і пад аховай чэха-славацкіх штыхоў прабрацца на Далёкі Ўсход. Надзеі гэтыя ня збыліся. Чэхі, баючыся, што ахова Калчака сустрэне перашкоду ў іхнай адпраўцы на радзіму з боку савецкай улады, якая аднаўлялася ў Сібіры, згадзіліся выдаць чорнага адмірала. І вось 15 студзеня, калі цягнік падходзіў пад станцыю Іркуцк, у вагон Калчака ўвайшоў чэскі камэндант і абвясьціў:

— Падрыхтуйцеся, адмірал, зараз вы будзеце выданы расійскай уладзе.

Па словах вачавідцаў, Калчак, які зусім не чакаў

такой разьвязкі, у роспачы схапіўся за галаву і ўскрыкнуў:

— Значыць, саюзьнікі мне здрадзілі!..

Калчак і яго галоўны міністар Пепеляеў, які ехаў разам з ім, зараз-жа быў арыштаваны.

І вось, былы «найвышэйшы кіраўнік», які яшчэ нядаўна быў у царскай пашане, і яго правая рука ў справе распраў з працоўнымі масамі Сібіры, міністар Пепеляеў, пад канвоем рабочых дружыньнікаў і рэволюцыйных салдат, пехатою адпраўляюцца са станцыі Іркуцк у горад, у губэрнскую турму. У тую самую турму, у сьценах якой усяго за некалькі дзён да гэтага агенты Калчака дзіка катавалі, каралі сьмерцю дзесяткі рэволюцыянэраў.

Іркуцкай турме суджана было стаць апошнім прытулішчам самазванага ўладара, які праліў цэлыя рэкі крыві сібірскіх сялян і рабочых.

Разам з Калчаком іркуцкай уладзе быў выдадзены і залаты запас, які Калчак спакушаўся ўзяць з сабою за граніцу.

У Іркуцку ў гэты час дажываў свае апошнія дні згодніцкі «часовы ўрад» эсэраў і меншавікоў. Ён арганізаваўся пасьля таго, як паўстанцы занялі Іркуцк—4 студзеня 1920 г. Урад гэты, які назваў сябе «політычным цэнтрам», імкнуўся аддзяліць усю усходнюю Сібір ад Расіі і ўтварыць тут «дэмократычны» лад і ўладу.

18 студзеня, па запатрабаваньню мясцовай організацыі комуністычнай партыі, ён перадаў сваю ўладу

рэўкому, на чале з т. Шырамавым. З гэтага моманту ўся Сібір, ад Уралу да Байкалу, стала *савецкай*.

Чырвоная армія, пасоўваючыся да Іркуцку з заходу, 7 студзеня ўвайшла ў Краснаярск, дзе перад гэтым дружнымі патугамі паўстанцаў было адбіта наступленьне каппелаўскіх атрадаў (рэшта былой калчакаўскай арміі, на чале з генэралам Каппелем).

Пасьля няўдачы пад Краснаярскам каппелеўцы адступілі ў напрамку на Іркуцк, з мэтаю прабіцца далей на ўсход. Ведаючы, што іркуцкі рэволюцыйны гарнізон невялікі, яны надумалі тут нагрэць рукі золатам і заадно вызваліць Калчака.

Набліжаючыся да Іркуцку, каппелеўцы запатрабавалі ў мясцовай рэволюцыйнай улады:—выдаць ім Калчака і яго золата, без перашкоды прапусьціць іхныя атрады на ўсход, забясьпечыўшы ўсім неабходным. Гэта запатрабаваньне ня было выканана, канешне, пачаліся бойкі на подступах да Іркуцку. Бойкі ішлі пры саракаградусным марозе з нязьмернай заядласьцю. Каппелеўцы былі разьбіты войскамі рэўкому пад камандай т. Зьверава.

Ад поўнага зьнішчэньня іх выратавалі чэхі, якія займалі лінію чыгункі, куды адступілі разьбітыя каппелеўцы.

Пасьля няўдачы, каппелеўцы, пад прыкрыцьцем чэхаў, абыйшлі Іркуцк бокам і памкнулі далеў на ўсход.

Гэта была апошняя спроба здыхаючай калчакаўшчыны вышчарацц свае драпежныя зубы. Абыйшоўшы Іркуцк, каппелеўцы пакіраваліся за Байкал.

Шмат хто з іх загінуў у часе гэтага пераходу і ад партызанскіх куль, і ад суровых саракаградусных марозаў, і ад высіленьня і хвароб. Тым, якія захаваліся, удалося дабрацца да Чыты, сталіцы атамана Сяменава.

Але спроба каппелеўцаў вызваліць Калчака скончылася дрэнна для чорнага адмірала. Яна паскорыла для яго заслужоную ім кару. У той момант, калі каппелеўцы падышлі пад Іркуцк, мясцовы рэўком на экстарным пасяджэньні, вынес пастанову аб неадкладным расстрэле Калчака і яго першага міністра Пепеляева. «Лепш кара двух злачынцаў, даўно вартых сьмерці, чымся гібель сотняй ахвяр»,—гаварылася ў пастанове рэўкому.

Досьвіткамі 7 лютага 1920 г. Калчак і Пепеляеў, разам з катам кітайцам, які павесіў не адзін дзесятак рэволюцыянэраў у Іркуцкай турме, былі выведзены за горад і тут расстрэлены, а трупы іхныя спушчаны пад лёд.

Гэтак няслаўна скончыў сваё жыцьцё адзін з самых буйных контр-рэволюцыянэраў, якім было зроблена столькі нячуваных злачынстваў.

Да рэчы сказаць, ня ўхілілася ад заслужонай расплаты і большасьць падручных адмірала Калчака. У часе адступленьня з Іркуцку быў забіты сваім-ж салдатам генэрал Волкаў, які ў свой час дапамагаў Калчаку захапіць уладу. Супрацоўнік Волкава ў гэтай справе, люты атаман Красільнікаў, памёр у аднэй з іркуцкіх больніц ад тыфусу. Арыштаваныя ў часе перавароту калчакаўскія міністры вясною 1920 г. судзіліся са-

вецкім судом у Омску, там дзе яны свавольнічалі, і па пастанове гэтага суду большасьць іх расстрэлена.



Суд над міністрам і Колчаком у Омску ў 1920 г.

Пазьней за іншых стаў перад савецкім судом атаман Аненкаў, пра злачынствы якога гэтак шмат га-

варылася ў гэтай кніжцы. Цэлых шэсьць гадоў гэты бандыт пражыў за савецкаў мяжой у Кітаі (з іх тры гады ён праседзіў у кітайскім астрозе за нейкае шальмоўства). Нарэшце, у 1926 годзе ён і яго падручны, генэрал Дзянісаў, былы начальнік аненкаўскага штабу, наважыліся зьявіцца з пакорай да савецкага ўраду, спадзяючыся на тое, што іх памілуюць. У жніўні 1927 г. абодва яны сталі перад савецкім судом у Сяміпалацінску, былой сталіцы Аненкава. На суд зьявіліся сотні сібірскіх сялян і тубыльцаў, каб пацьвердзіць пра злачынствы крывавага атамана і патрабаваць для яго суровай кары за ўсе яго беззаконнасьці. Па пастанове суду, Аненкаў і Дзянісаў былі расстрэлены.

Такім чынам, у студзені 1920 г. уся Сібір да Уралу да Байкалу была ачышчана ад белагвардзейскіх банд і ў ёй адноўлены савецкі лад. Заставаўся яшчэ не савецізаваным Дальняўсходні край. Там яшчэ лютавалі разбойніцкія банды атамана Сямёнава (у Забайкальлі), Калмыкава (ва Усурыйскім краі) і генэрала Розанава (ва Ўладзівастоку), лютасьць якіх была ня меншай за аненкаўскую. Але і яны дажывалі свае апошнія дні. Увесь Дальняўсходні край ужо быў ахвачаны агнём рабоча-сялянскіх паўстаньняў і хутка чорная атаманаўская ўлада і тут упала назаўсёды.

«Сібірскае ліхалецьце» скончылася.

Рабочы Факультэт
БІБЛІЯТЭКА

# ЗЬМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Сібірскае ліхалецьце | 3 |
| Як аселася ў Сібіры контррэволюцыя | 5 |
| Пад сьцягам народнага кіраваньня | 8 |
| Слаўгародзкае паўстаньне | 11 |
| Як Аненкаў уціхамірваў слоўгародцаў | 18 |
| Пад знакам чэрапа і касьцей | 26 |
| Сяміпалацінскія зьверствы | 33 |
| Па прыкладу атамана Аненкава | 42 |
| Запанаваньне чорнага адмірала | 49 |
| Гульба калчакаўшчыны | 59 |
| Сяляне і рабочыя паўстаюць супроць Калчака | 65 |
| Жахі Сямірэчча | 75 |
| Партызаншчына | 89 |
| Канец калчаковіі | 103 |

1964

Бум. адлзсн
1994 г.

ЦАНА 40 кап.

B00000002600 137